

# «МЫ НЕ ПАМЫЛЯЕМСЯ, ШТО ЗАЙМАЕМСЯ ЗДАБЫЧАЙ ВЕЛЬМІ КАРЫСНЫХ І ПАТРЭБНЫХ МІНЕРАЛЬНЫХ УГНАЕННЯЎ»

**Чаму новы горна-абагачальны комплекс — больш чым проста прадпрыемства**

(Працяг на стар. 2–4)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 мая СУБОТА № 99 (30487)



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# УЧОРА — ВЫПУСКНІК, СЁННЯ — МАЙСТАР

**VI Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства ProfSkills Belarus 2025 стартаваў у Мінску**

На пляцоўках сталічнага Футбольнага манежа, Falcon Club і Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка гэтымі днямі асабліва шматлюдна: сотні канкурсантаў з Беларусі, Расіі, краін блізкага і далёкага замежжа пазмагаюцца за званне найлепшых у розных сферах дзейнасці. Зрабіць цагляны мур, адрамантаваць аўтамабіль, сабраць кампазіцыю букета і распрацаваць мабільны дадатак — для ўдзельнікаў Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства ProfSkills Belarus 2025 няма невыканальных задач, яны прадэманструюць здольнасці ў 50 кампетэнцыях. У гэтым пераконваемся на свае вочы.

СТАР. 5

МЕХАНІЗАТАР ПРА ПЕРАВАГІ ПРАЦЫ НА СЯЛЕ 6



З НАГОДЫ

# У ГАРМОНІІ З ПРЫРОДАЙ

**Спецыяліст Мінпрыроды — аб захаванні біялагічнай разнастайнасці**

Начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Таццяна ЖАЛЯЗНОВА адзначыла, што захаванне біяразнастайнасці — аснова дабрабыту чалавецтва, а ўстойлівае развіццё мае на ўвазе вырашэнне эканамічных і сацыяльных задач без пагаршэння экалагічных праблем. У Беларусі гэта прыярытэтны кірунак дзяржаўнай палітыкі.

СТАР. 13



**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

25099>

# «МЫ НЕ ПАМЫЛЯЕМСЯ, ШТО КАРЫСНЫХ І ПАТРЭБНЫХ

## Чаму новы горна-абагачальны комплекс —

**Адзін з найбуйнейшых у краіне інвестыцыйных праектаў, рэалізацыю і значэнне якога разгледзелі на вышэйшым узроўні. Падчас рабочай паездкі ў Мінскую вобласць Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў горна-абагачальны комплекс, размешчаны ў Любанскім раёне. Кіраўнік дзяржавы асабіста азнаёміўся з будаўніцтвам комплексу і абазначыў, чаму гэты аб'ект надзвычай важны як для Любанскага раёна, так і для ўсёй краіны.**



### «КАЛІ МЫ МОЖАМ ПАГЛЫБЛЯЦЦА, ТРЭБА ПРАЦЯГВАЦЬ БУДАЎНІЦТВА»

На цяперашні момант на комплексе ўжо вядуцца работы на гарызонце, пачата здабыча руды — з шахты дасталі больш за 300 тысяч тон. На будаўніцтве задзейнічаны звыш трох дзясяткаў беларускіх арганізацый, з пачатку года тэмпы работ нарасцілі ў тры разы. Праектам прадугледжана будаўніцтва на абагачальнай фабрыцы дзвюх ліній, кожная праектнай магутнасцю 1 мільён тон хларыду калію ў год. Адна з іх гатова на 90 %. У найбліжэйшы час плануецца пачаць падачу на яе руды і прыступіць да вытворчасці ўгнаенняў.

Горна-абагачальны комплекс у Любанскім раёне будзе вырабляць высакаякасныя калійныя ўгнаенні — белы калій. Гэта вельмі запатрабаваны на сусветным рынку прадукт. ГАК плануе яго экспартаваць, у асноўным, у Кітай. «Мы цяпер разглядаем таксама магчымасць перапрацоўкі калійных угнаенняў і будаўніцтва дадатковай вытворчасці такіх прадуктаў як, напрыклад, нітрат калію, сульфат калію, каб таксама атрымліваць дабаўленую вартасць», — далажыў першы намеснік дырэктара комплексу Іван Галаваты.

> **«Калі дзесьці ў нечым мы можам паглыбляцца, трэба працягваць будаўніцтва. Усё, што нам трэба, неабходна рабіць», — паставіў задачу Прэзідэнт.**

Мяркуецца, што да 2026 года прадпрыемства ўвойдзе ў нармальны рэжым работы і паступова будзе нарошчваць магутнасці да праектнага ўзроўню. У той рудзе, якая здабываецца, прыкладна 25 % — карысная прадукту, што ў цэлым нядрэнна. Так, са 100 кілаграмаў руды 75 кг — адходы. Аляксандр Лукашэнка даручыў уважліва прадумаць, што з імі рабіць. «Нам неабходна прыняць нейкае рашэнне па дадзеным пытанні. Трэба думаць, што мы будзем рабіць з гэтымі адходамі. Абавязкова», — дадаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што работа над вытворчасцю мінеральных угнаенняў будзе працягвацца, таму трэба думаць на перспектыву аб стварэнні падобных вытворчасцяў. Логіка простая: свету патрэбна харчаванне, а для гэтага неабходны мінеральныя ўгнаенні. Галоўнае, па словах беларускага лідара, не падманваць сваіх партнёраў, і тады попыт на прадукцыю будзе ў самых розных краінах. «Афрыку трэба карміць. У Азіі прырост насельніцтва вялізны, у адрозненне ад Еўропы, Расіі і нас», — канстатаваў ён.

### «ТУТ ПАВІНЕН БЫЦЬ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫ ЦЭНТР»

Аляксандр Лукашэнка параўнаў горна-абагачальны камбінат з атамнай электрастанцыяй. Гэта вельмі складанае прадпрыемства, але надзвычай важнае для краіны. Калі пабудавалі атамную станцыю, шмат сіл і намаганняў уклалі ў мадэрнізацыю Астраўца, будавалі жыллё, сацыяльную інфраструктуру для работнікаў станцыі. Тое ж самае, па словах Прэзідэнта, трэба зрабіць у Любані. «Тут павінен быць індустрыяльны цэнтр. Ну, калі не цэнтр ужо, то напалову цэнтр. Любань, па-першае, прыгожы будзе горад. Прырода тут добрая. Мы гэта павінны зберагчы. Але Любань трэба адбудоўваць, як у Салігорску, як у Астраўцы. Таму школы, паліклінікі, дзіцячыя садкі... пакуль без празмернасцяў. Трэба людзям даць, дзе жыць. І жыллё па інвестыцыйнай праграме мы сюды пераарыентуем. Дафінансаванне будзе ў прыярытэтным парадку. Тут усё павінна быць ідэальна, — акрэсліў яшчэ адзін блок задач кіраўнік дзяржавы. — Аб'ект пабудаваны. Людзі патрэбныя. Пад гэта мы будуем сацыяльную інфраструктуру. Для людзей будзем рабіць усё. Менавіта пад вытворчасць. Вытворчасць, жыллё, уся сацыяльная інфраструктура. Тады будзе толк у краіне».

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што яго прыемна здзівіў старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей Кушнарэнка, прызначаны на гэту пасаду некалькі месяцаў таму. «Я ў акно гляджу, вывучаю ж — не пазнаю Любанскі раён, Салігорскі, яны ж заўсёды былі нядрэнныя. Але я ўвогуле не пазнаю, Еўропа «адпачывае», — падзяліўся ён. — Палі апрацаваныя. Каналы ачышчаныя, не ўсё, праўда, ачысціў, можа, і таму, што не было вольнага шмат. Усё апрацавана».

Аляксандр Лукашэнка расказаў губернатару пра цікавы эксперымент з небывалым ураджаем бульбы, які праводзіцца ў гаспадарцы «Усход». Там пасадзілі бульбу на тэрыторыі каля 20 гектараў, забяспечылі паліў і абяцаюць сабраць ураджай больш





# ЗАЙМАЕМСЯ ЗДАБЫЧАЙ ВЕЛЬМІ МІНЕРАЛЬНЫХ УГНАЕННЯЎ»

## больш чым проста прадпрыемства

за 1 тысячу ц/га, у той час як звычайная сярэдняя ўраджайнасць гэтай культуры ў Беларусі вар'іруецца ў раёне 300 ц/га. «Нам трэба мецъ гэта на ўвазе. У нас жа рэкі, азёры вакол, а не хапае вільгаці. Дык давайце палівацъ хоць бы гародніну, бульбу гэту. Дзесьці садавіну, сады пасадзім і будзем прадаваць. Можа, цяпліцы, можа, адкрыты грунт, агародніна. Гэта трэба абдумаць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Да прызначэння ў Мінаблвыканкам Аляксей Кушнарэнка займаў пасаду міністра энергетыкі і ўвесь яго кар'ерны шлях звязаны з гэтай сферай. Прэзідэнт раскрыў сакрэт, чаму выбраў яго кандыдатуру на пасаду кіраўніка Мінскай вобласці, а мэтанакіравана не выбраў аграрыя. Ён згадаў сваё наведванне сельскагаспадарчага прадпрыемства «Газавік-Сіпакова» ў Шклоўскім раёне, якое ў веданні Мінэнерга і за якое адказваў Аляксей Кушнарэнка. «Калі нутро вясковае, то і на зямлі будзеш працаваць. Я табе тады задаў пытанне: «Ну, а гаспадарка твая — увесь час ім грошы даеш?» «Не, — кажа, — яны на самаакупнасць выйшлі, працуюць», — распавёў кіраўнік дзяржавы. Ён згадаў, што стан гэтага прадпрыемства ашаламляльна адрозніваецца ад таго, што было ў савецкі перыяд. «Нічога не зламанае, нічога не выкінутае, усё прыведзена ў парадак. Гаспадарка працуе. Так што я памятаю вось гэту тваю струнку», — заўважыў беларускі лідар.

З іншага боку, адзначыў кіраўнік дзяржавы, аграрыям часам уласціва «ўваходзіць у становішча», калі да іх звяртаюцца кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў са скаргамі на тыя ці іншыя абставіны, просяць фінансавай падтрымкі. «Таму я мэтанакіравана, разумеючы, што ты не аграрый, прызначаў цябе губернатарам. Хоць там іншыя былі прапановы, як заўсёды, — альтэрнатыва», — удакладніў ён.

### РАЗВІВАЦЬ ТОЕ, ШТО ЁСЦЬ І СТВАРАЦЬ НОВАЕ

Аляксандру Лукашэнку прадэманстравалі ўзоры шахтавай тэхнікі. Кіраўнік дзяржавы таксама праехаў па тэрыторыі і агледзеў ход будаўнічых работ на камбінаце. Завяршэнне будаўніцтва комплексу і ўводу яго ў эксплуатацыю абмяркавалі на нарадзе з удзелам Прэзідэнта.

**«Краіна жыве і развіваецца, калі ствараюцца новыя прадпрыемствы, мадэрнізуюцца старыя. Калі ёсць інвестыцыі ў вытворчасць і сацыяльную сферу», — адзначыў беларускі лідар.**

Ён звярнуў увагу, што ў краіне ёсць шмат школ і прадпрыемстваў, дзе работа ідзе «паявярхоўна» і дзе ёсць магчымасць паглыбляцца. У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў цэлюлозу, якую выпускаюць беларускія вытворцы і пастаўляюць на экспарт. Але па факце гэта паўфабрыкат, з яго ў іншых краінах робяць кардон, які потым жа беларусы і купляюць. Па словах кіраўніка дзяржавы, гэта ненармальна. Таму было прынята рашэнне аб будаўніцтве новага завода па вытворчасці кардону. І такіх прыкладаў у краіне нямала. Аляксандр Лукашэнка вылучыў два шляхі развіцця вытворчасці ў краіне.

«Сёння тэхналогіі выраслі, з'явіліся новыя, трэба паглыбляцца і развівацца. Гэта першы шлях. Людзі ёсць, школы ёсць, умеем гэта рабіць, не трэба кагосьці вучыць-перавучваць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Другі шлях — стварэнне новых прадпрыемстваў. Горна-абагачальны камбінат у Любанскім раёне — гэта новае прадпрыемства. І ў той сферы, дзе ёсць тэхналогіі, школы, дзе падрыхтаваныя людзі. Прыватны інвестар, які ўзяўся за будаўніцтва горна-абагачальнага камбіната, не змог яго прадоўжыць пасля ўвядзення санкцый. Тады на ўзроўні кіраўніка дзяржавы было прынята рашэнне, што беларусы пабудуюць комплекс самастойна.

«У сілу пэўных умоў мы зацягнулі будаўніцтва гэтага прадпрыемства.

**Будзем цяпер разумець, што нам трэба рабіць сваімі рукамі са сваіх матэрыялаў — усё павінна быць сваё. Тады мы будзем залежаць толькі ад саміх сябе», — падкрэсліў Прэзідэнт.**

І будаўніцтва новага прадпрыемства па здабычы калійных угнаенняў (а пра гэта ўжо ідзе гаворка, таму што белы калій, які тут здабываюць, вельмі запатрабаваны ў свеце), па словах кіраўніка дзяржавы, трэба прадугледжваць і планаваць. Найперш, каб захаваць калектыў прафесіяналаў, які пабудаваў гэты аб'ект.

**«Трэба разумець, што ядро адсюль павінна пераехаць на новае радовішча і будаваць такі ж камбінат на новым месцы. На працягу адной пяцігодкі. Не больш», — паставіў задачу Прэзідэнт. За ўзор ён параіў узяць падобнае прадпрыемства ў Петрыкаве.**

### «ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАННЯ БЕЗ МІНЕРАЛЬНЫХ УГНАЕННЯЎ НЕ БЫВАЕ»

Што датычыцца камбіната ў Любанскім раёне, то яго будаўніцтва сёлета будзе скончана. «Рынак ёсць, мы будзем будаваць новы камбінат, як я сказаў. Але адна агаворка: рынак, рынак, рынак. Калі будзе куды прадаць нашу прадукцыю па добрай цане. Будзе.

**Людзі хочуць есці — прадуктаў харчавання без мінеральных угнаенняў і арганікі не бывае. Таму мы тут не памыляемся, што развіваем гэта будаўніцтва і займаемся здабычай вельмі карысных і патрэбных мінеральных угнаенняў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.**

Так, супраць калійных угнаенняў уведзены санкцыі, але «Беларуськалій» ужо выйшаў на ўзровень продажу калійных угнаенняў дасанкцыйнага перыяду.

**«Немагчыма санкцыямі стрымаць развіццё любой краіны, нават невялікай. Немагчыма. Тыя, хто ўводзіць санкцыі, калісьці выступалі за глабалізацыю, за глабальныя сувязі і іншыя. Ну так усе краіны ўвязалі ў гэту глабалізацыю. Як сёння можна вырваць нейкі ланцуг? Немагчыма.**

Таму заўсёды будуць патрэбныя мінеральныя ўгнаенні. На гэтым кірунку будзем дзейнічаць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

### «ЁСЦЬ ВЫТВОРЧАСЦЬ — ЁСЦЬ ГРОШЫ»

Прэзідэнт звярнуў увагу яшчэ на адзін важны аспект, звязаны з будаўніцтвам камбіната, — добраўпарадкаванне Любані. Ён адзначыў, што развіццё горада павінна быць уключана ў дзяржаўную інвестыцыйную праграму. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу — зрабіць Любань прыгожым сучасным горадам гарнякоў з неабходнай сацыяльнай інфраструктурай. І, вядома, забяспечыць работнікаў горна-абагачальнага камбіната жыллём.

**«Але вытворчасць на першым месцы. Людзі павінны разумець: ёсць вытворчасць — ёсць грошы. Няма вытворчасці — няма грошай і ніякай сацыяльнай інфраструктуры быць не можа», — падкрэсліў Прэзідэнт.**

*(Заканчэнне. на 4-й стар.)*





# «МЫ НЕ ПАМЫЛЯЕМСЯ, ШТО ЗАЙМАЕМСЯ ЗДАБЫЧАЙ ВЕЛЬМІ КАРЫСНЫХ І ПАТРЭБНЫХ МІНЕРАЛЬНЫХ УГНАЕННЯЎ»

*(Пачатак на 2–3-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што запуск горна-абагачальнага комплексу кардынальным чынам зменіць эканоміку не толькі Любанскага раёна, але і ўсёй паўднёвай часткі Міншчыны. «Таму што дасць новыя працоўныя месцы з добрай заработнай платай. А следам, як гэта ўжо было ў Астраўцы, Рудзенску або зусім нядаўна ў Петрыкаве, павялічыцца насельніцтва, і ўзровень жыцця людзей павінен таксама павысіцца. Пад самыя высокія стандарты падцягнецца ўся інжынерная інфраструктура. Мы будзем будаваць жыллё, сацыяльныя і іншыя аб'екты. Але людзям трэба казаць, што галоўнае — вытворчасць», — растлумачыў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Астраўцы ўжо задалі вызначаны «залаты стандарт» развіцця нават не раёна, а той тэрыторыі, дзе знаходзіцца АЭС. Такім павінен быць Любанскі край. «Вельмі цікавы край. Прыгожы. Выдатная прырода. І ў гэтым рэгіёне наш камбінат — цэнтральнае звяно», — канстатаваў ён. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ўсе пытанні, звязаныя з гэтым, на сённяшні дзень вырашаны. Па яго словах, гэта будоўля нумар адзін і не толькі таму, што яна дасць прыбаўку дзяржаве, а таму, што яна знаходзіцца на завяршальным этапе.

**«Гэта вельмі паказальны аб'ект, аб чым я казаў, што санкцыі — гэта час магчымасцяў. І ніхто нас на калені паставіць не можа, калі мы разам, калі мы адзіныя і калі мы нацэленыя на рэалізацыю той ідэі, якая была закладзена першапачаткова», — падсумаваў беларускі лідар.**

## «МЫ ДЭМАНСТРУЕМ МОЛАДЗІ ТАКІ ШЛЯХ»

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што на яго ўзроўні трэба больш актыўна вызначаць перспектыўныя кірункі. Як прыклад, выкарыстанне мясцовай паліўнай сыравіны і, у прыватнасці, вытворчасць пелет з драўняных адходаў. Пра важнасць гэтага кірунку кіраўнік дзяржавы казаў неаднойчы. Ён распавёў аб найбліжэйшых планах азнаёміцца з тым, як вырашаецца гэта праблема на практыцы. «У свой час я даручыў пабудаваць некалькі заводаў па вытворчасці пелет. Хламу, смецця ў лесе мора. Здрабніць усё, перапрацаваць і зрабіць гранулы для таго, каб ацяпляць памяшканне. Пачалі рабіць. Трапілі пад санкцыі. Вохкаюць: «Няма каму прадаць!». Не трэба прадаваць, давайце будзем выкарыстоўваць у сябе. Катлы зрабілі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Дранка, пелеты замест прыроднага газу і нафты, нафтапрадуктаў. Паглядзім, як мадэрнізавалася звычайнае ў правінцыі прадпрыемства і якую прадукцыю выпускае. Гэта таксама наша перспектыва — перапрацоўка тых драўняных адходаў. Іх мора ў лесе. І тут будзе жым вельмі сур'ёзны. Людзям якая розніца, адкуль цяпло паступіць. А мы спальваем тое, што ў нас прападае, і маем ад гэтага эфект і карысць».

Прэзідэнт растлумачыў, што ўдзяляць увагу падобным перспектыўным кірункам цяпер асабліва важна, каб прадэманстраваць новаму пакаленню шлях развіцця краіны.

**«Яны павінны бачыць сістэму нашай работы. Захочуць — няхай бяруць на ўзбраенне ў будучыні. Не захочуць — няхай прапануюць лепш. Але потым з іх жа народ беларускі спытае. Вельмі важна, каб яны разумелі, што гэта наш шлях, мы дэманструем моладзі гэты шлях. І за пяцігодку мы павінны гэта зрабіць».**

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**
*Любанскі раён.*





**У тэму**

## Беларусь робіць важкі ўнёсак у харчовую бяспеку свету



**Першы намеснік Прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ** падкрэсліў, што горна-абагачальны камбінат у Любанскім раёне — прадпрыемства важнае не толькі для нашай краіны. «Беларусь — дзяржава, якая ўплывае на сусветны рынак калію. Мы з'яўляемся адным з буйных вытворцаў у свеце, тым самым мы ўносім магутную, я сказаў бы, асноватворную лепту ў харчовую бяспеку свету», — адзначыў ён.

Першы віцэ-прэм'ер адзначыў, што пры рэалізацыі любога інвестыцыйнага праекта самае галоўнае — час: чым хутчэй узводзіцца прадпрыемства або іншы аб'ект, тым больш гэта выгадна з пункту гледжання фінансавых выдаткаў. Мікалай Снапкоў расказаў, што ў выпадку з Любанскім комплексам, дзеля выканання задач Прэзідэнта, тэрміны выхаду на праектную магутнасць зрушаны з 2027 на 2026 год. «Вядома, гэта дае пэўную эфектыўнасць і добрую эканомію сродкаў», — удакладніў віцэ-прэм'ер.



**Намеснік дырэктара горна-абагачальнага комплексу Іван ГАЛАВАТЫ** расказаў журналістам, што гэта прадпрыемства дазволіць на працягу 50 гадоў здабываць руду, перапрацоўваць яе ў якасныя калійныя ўгнаенні. Важна адзначыць, што тэрмін у 50 гадоў — мінімальны. Напрыклад, калі асвойваліся руднікі ў Салігорску і будавалася рудаўпраўленне, разлічвалі, што яны будуць дзейнічаюць 50 гадоў, а яны ўжо працуюць больш за 60. «Калійныя запасы ў нашай краіне разлічаны і разведаны больш чым на 120 гадоў», — удакладніў Іван Галаваты. Таму, заканчваючы будаўніцтва аднаго рудаўпраўлення, спецыялісты пераходзяць на новы аб'ект.

«Мы падымаем з шахты руду. Напрыклад, 100 кілаграмаў руды, з яе 25 — калійных угнаенняў. Далей на фабрыцы гэта руда перапрацоўваецца, вылучаецца карысны кампанент — калій. І далей мы атрымліваем угнаенне. Белае і чырвонае адрозніваецца не толькі па колеры. Белае ўгнаенне больш якаснае, чым чырвонае, гэта звязана з тэхналогіяй перапрацоўкі», — расказвае Іван Галаваты.

На горна-абагачальным камбінаце ў Любанскім раёне на сённяшні з шахты паднялі ўжо больш за 300 тысяч тон руды. У цяперашні час заканчваецца будаўніцтва абагачальнай фабрыкі. Цяпер руда назапашваецца, а пасля пусканаладачных работ пачнецца вытворчасць калійных угнаенняў.



**Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей КУШНАРЭНКА** падкрэсліў, што ўвод у эксплуатацыю горна-абагачальнага комплексу станоўча паўплывае на развіццё Любанскага раёна. «Гэта прарыўны для ўсяго раёна праект, які дазволіць стварыць 1200 працоўных месцаў у перспектыве. На сёння іх 450, да канца года будзе 800. Каб прыцягваць сюды спецыялістаў і яны тут заставаліся, неабходна будаваць інжынерную і сацыяльную інфраструктуру, што ўжо робіцца. Пабудаваны два дамы на 170 кватэр, у перспектыве будуць яшчэ. Мы заняліся рамонтам дарог, добраўпарадкаваннем горада. Ёсць патрэба ва ўзвядзенні паліклінікі. І мы будзем рабіць усё, каб горад развіваўся», — расказаў губернатар. Аляксей Кушнарэнка паведаміў, што бюджэт Любанскага раёна датацыйны, ён складае 113 мільёнаў рублёў, датацыі — каля 27 %. З запускам вытворчасці на горна-абагачальным комплексе, са стварэннем высокадаходных рабочых месцаў за кошт паступлення падаткаў мясцовы бюджэт працэнт датацый будзе зніжаны, дадаў губернатар.

КАДРАВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

# ДЗЕЙНАСЦЬ У ТАНДЭМЕ

## Прэм'ер-міністр: урад ускладае на Акадэмію навук вялікія надзеі

Пра гэта заявіў Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН, прадстаўляючы ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі новага старшыню Прэзідыума НАН Уладзіміра КАРАНІКА.



— Уладзімір Сцяпанавіч — вопытны кіраўнік. Ён быў міністрам аховы здароўя ў вельмі складаныя часы — у перыяд пандэміі, а таксама старшынёй Гродзенскага аблвыканкама, віцэ-прэм'ерам, які курыраваў сацыяльную сферу. І вось новае прызначэнне — найважнейшае, на мой погляд, у кар'еры Уладзіміра Сцяпанавіча. Акадэмія навук, без перабольшання, найважнейшае звяно, без навукі сёння немагчыма нічога зрабіць. Наш век — век тэхналогій, навуковых адкрыццяў. Напярэдадні новага пяцігадовага цыкла, у перыяд распрацоўкі новых праграмных дакументаў урад ускладае вялікія надзеі на Акадэмію навук, на яе дапамогу ў рабоце, у выкананні задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы, — сказаў Аляксандр Турчын.

На яго думку, Уладзімір Каранік арганічна ўпішацца ў калектыў НАН.

— І ўсе мы разам будзем вырашаць вельмі складаныя задачы, якія стаяць перад нашай краінай. Урад і Акадэмія навук заўсёды працавалі разам, у тандэме. Гэта будзе працягвацца і далей, мы будзем працаваць на карысць Беларусі. Хачу пажадаць поспехаў на новай ніве, — адзначыў Прэм'ер-міністр.

Ён таксама падзякаваў за працу папярэдняму кіраўніку НАН Уладзіміру Гусакову.

Са свайго боку Уладзімір Каранік адзначыў высокія дасягненні Акадэміі навук.

— Калектыў — гэта самае каштоўнае ў любой арганізацыі, а ў Акадэміі навук гэта 95 % поспеху. Упэўнены, што ў акадэмічных інстытутаў і НАН у цэлым не толькі слаўная гісторыя, але і слаўная будучыня. Мы павінны памятаць дасягненні нашых папярэднікаў, каб іх развіваць і рухацца далей. Задачы перад намі стаяць маштабныя. Сёння адбываецца пераход на новы тэхналагічны ўзровень, глабальная барацьба за розумы і інавацыі. Наша задача — знайсці сваё месца ў гэтым свеце, які хутка змяняецца, забяспечыць нашу эканоміку прыкладнымі навуковымі распрацоўкамі, што дазволіць нашай прадукцыі быць канкурэнтаздольнай на знешніх рынках, але не забываць і пра фундаментальную навуку, якая закладвае асновы для будучых пакаленняў. Гуманітарны кірунак таксама важны, гэта гісторыя, душа народа, якую мы павінны захаваць для таго, каб памятаць свае карані, захаваць сваю самабытнасць і ідэнтычнасць. Па меры магчымасці будзем падтрымліваць усе кірункі, — падкрэсліў ён.

Уладзімір Каранік акцэнтаваў увагу на тым, што Беларусь займае другое месца ў СНД па выдатках на навуку адносна ВУП.

— Паводле стратэгіі развіцця плануецца істотнае павелічэнне выдаткаў на навуку. Наша задача — забяспечыць, каб павелічэнне фінансавання прывяло да якаснага скачка ў навуковых распрацоўках, з'яўлення новых прарыўных праектаў, якімі мы ўсе будзем ганарыцца, — падкрэсліў старшыня Прэзідыума НАН.

**Па матэрыялах БелТА.**

# УЧОРА — ВЫПУСКНІК, СЁННЯ — МАЙСТАР



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## «АГРАНОМІЯ»

Сёння беларуская сельская гаспадарка — гэта сучасныя тэхналогіі, выдатныя перспектывы і вялікія магчымасці. У гэтым упэўненыя канкурсанты кампетэнцыі «Аграномія». Маладыя людзі звязваюць сваё жыццё з такім важным кірункам свядома, бо разумеюць: за імі — харчовая бяспека краіны. Дарэчы, у аграгамічным конкурсе сёлета ўдзельнічаюць і замежныя госці. Сярод іх — **канкурсант Мікалай ЛЯПЕХІН**, які прыехаў да нас з Расіі. Ён навучаецца на 4-м курсе Томскага аграрнага каледжа. Малады чалавек падзяліўся ўражаннямі аб прафесійным мерапрыемстве: «Мне вельмі падабаецца атмасфера конкурсу. А яшчэ — гэта добрая нагода прыехаць у Беларусь. Я быў прыемна здзіўлены тым, што ў вашай краіне чыста і прыгожа, тут сочаць за парадкам».

Будучую прафесію Мікалай выбраў свядома: «Мой дзядзька параіў мне звязаць жыццё з аграноміяй. Я вывучаю прафесію, мне яна падалася важнай, прывабнай, я канкрэтна захапіўся гэтай справай, грунтоўна паглыбіўшыся ў спецыяльнасць».

Першы этап конкурсу — ідэнтыфікацыя палявых культур. З гэтым Мікалай справіўся паспяхова. «Нам неабходна было вызначыць палявыя культуры па насенні, па прарастках і па ілюстрацыях. Вынікі пакажуць, але думаю, што справіўся паспяхова. Вялікіх чаканняў у прынцыпе няма. Я прыехаў сюды не дзеля перамогі, а па каштоўны вопыт, бо гэта, як па мне, — самае важнае».

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

## «РЭСТАРАННЫ СЭРВІС»

У кампетэнцыі «Рэстаранны сэрвіс» за званне найлепшых спаборнічаюць маладыя людзі — студэнты каледжаў. Сярод іх — **Паліна ВАШКОВА.** Сёння яна заканчвае 2-і курс у Гомельскім дзяржаўным каледжы гандлю і паслуг. Дзяўчына прызналася, што для яе гэта першы маштабны конкурс, у якім удзельнічае: «Хлусіць не буду, вельмі хвалююся. А прафесію бармена-афіцыянта выбрала нездарма. Мне заўсёды было цікава, як адбываецца змешванне кактэйляў. Цікавілі і зносіны з рознымі людзьмі, а таксама магчымасць даведацца больш аб спалучэнні напояў, самой сутнасці змешвання смакаў і інгрэдыентаў».

Конкурс для будучых афіцыянтаў падзелены на чатыры модулі. Першы звязаны з абслугоўваннем імправізаванага рэстарана. «Да нас прыходзяць людзі, мы іх праводзім за стол, размаўляем, адначасова абслугоўваючы іх. А яшчэ ў адпаведнасці з конкурснай праграмай наперадзе ў нас — работа на банкеце», — расказала Паліна.

Паводле слоў канкурсанткі, для паспяховага абслугоўвання наведвальнікаў неабходна прытрымлівацца пэўных правіл: «Галоўнае — заўсёды быць ветлівымі з людзьмі, умець знаходзіць падыход да кожнага. Не менш важная ў нашай прафесіі стрэсаўстойлівасць. Без гэтай якасці працаваць з людзьмі наўрад ці атрымаецца».

## «ТЭХНАЛОГІЯ МОДЫ»

Прафесія швачкі або мадэльера важная для грамадства. Яна забяспечвае людзей адзеннем, аксесуарамі, прадметамі інтэр'ера і іншымі тэкстыльнымі вырабамі. Швачка таксама адыгрывае важную ролю ў развіцці творчага і эстэтычнага ўспрымання. У кампетэнцыі «Тэхналогія моды» на званне найлепшага спаборнічаюць некалькі чалавек. Сярод іх — **канкурсантка Крысціна ГРЭНЬ**, якая вучыцца ў Баранавіцкім дзяржаўным каледжы тэхналогіі і дызайну. Яна таксама падзялілася сваімі ўражаннямі: «Прыхільнасць да гэтай прафесіі з'явілася ў мяне з дзяцінства. Можна сказаць, тут сыграў спадчынны фактар — дзве мае бабулі і маці па прафесіі былі звязаны са швейнай справай. Вось і я вырашыла працягнуць такую сямейную традыцыю».

На конкурсе Крысціна адчувае сябе ўпэўнена. Яно і нядзіўна, бо на абласным этапе дзяўчына заняла першае месца. Сёння яна па сутнасці прадстаўляе ўсю Брэсцкую вобласць. Пасля заканчэння вучобы плануе працаваць майстрам вытворчага навучання ў родным Кобрыне. «Для мяне ўдзел у рэспубліканскім конкурсе — важны досвед. Акрамя таго, гэта ўнікальная магчымасць паглядзець, як працуюць мае аднагодкі з іншых краін».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

МАЛАДАЯ ЗМЕНА

# У ХВАЛЮЮЧЫ І АДКАЗНЫ ЧАС — РАЗАМ

## Выпускнікі з усёй краіны наведалі знакавае месца памяці Гомельшчыны

Двухдзённую насычаную і пазнавальную праграму паўднёва-ўсходні рэгіён падрыхтаваў для выпускнікоў — удзельнікаў рэспубліканскага свята «Апошні званок».

Найлепшых прадстаўнікоў школ раёнаў, рэгіёнаў, пераможцаў алімпіяд, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, спартыўных спаборніцтваў, а ў цэлым 1700 выпускнікоў з розных куткоў краіны ўпершыню прыняў Гомель — маладзёжная сталіца — 2025.

У першы дзень свята на плошчы перад Гомельскім Лядовым палацам прайшла цырымонія адкрыцця ўрачыстай лінейкі. З агульнарэспубліканскім «Апошнім званком» школьнікаў павіншавау **намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый АЛЕЙНІКАЎ.** Ён зачытаў прывітальны адрас да беларускіх выпускнікоў, іх педагогаў, бацькоў ад **старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана КРУПКО.**

— Памятайце, куды б вы не ішлі, малая Радзіма чакае вас, каб разам будаваць моцную і незалежную Беларусь. Моладзь, вам даюцца вялікія магчымасці для самарэалізацыі. Упэўнены, вы іх выкарыстаеце. Ваш патрыятызм, самааддача і талент дазваляюць з аптымізмам глядзець у заўтрашні дзень. За вамі светлая будучыня нашай любімай Беларусі, — адзначыў Дзмітрый Алейнікаў і падкрэсліў, што Гомель з радасцю і гонарам прымае найлепшых выпускнікоў краіны.

Аб тым, што найлепшыя з лепшых школьнікаў на рэспубліканскім свяце «Апошні званок» адзначаны пераможцамі ў шэрагу намінацый, нагадаў **міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй ІВАНЕЦ.**

— Хочацца ў чарговы раз падтрымаць і педагогаў, і бацькоў, і дзяцей за тое, што яны на высокім узроўні праявілі сябе за гады вучобы ў школе. Бо сёння нашы вучні паказваюць цудоўныя вынікі не толькі на прадметных міжнародных алімпіядах, але і ў спартыўных спаборніцтвах, творчых конкурсах. Хочацца адзначыць усіх. І ўзнагароды дакладна знойдуць сваіх герояў на школьных гарадскіх, раённых «апошніх званках», — пажадаў поспехаў міністр адукацыі.

Другі дзень рэспубліканскага свята «Апошні званок» на Гомельшчыне прысвяцілі патрыятычнаму выхаванню моладзі і знаёмству са знакавым месцам захавання гістарычнай памяці. Школьнікі наведалі мемарыяльны комплекс «Партызанская крынічка» ў Гомельскім раёне.

Адной з удзельніц рэспубліканскага свята «Апошні званок» на Гомельшчыне стала выпускніца Гомельскага дзяржаўнага абласнога ліцэя Марыя Кабаева:

— Заўжды была вельмі актыўнай. З радасцю ўдзельнічала ва ўсіх школьных мерапрыемствах, а таксама спрабавала свае сілы ў алімпіядах. Шчыра кажучы, не чакала запрашэння на такое свята. Вельмі ўдзячная. Выбрала для паступлення Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Планую звязаць сваё жыццё з матэматыкай. І калі адвучуся, мару вярнуцца дадому на Гомельшчыну, — распавяла дзяўчына.

Марыя прыехала на свята разам з мамай Людмілай.

— Дзякуй краіне за такое свята для дзяцей, якія сваёй працай (а вучыцца — гэта таксама цяжкая адказная праца) будуць праслаўляць свае навучальныя ўстановы, — падзякавала Людміла Кабаева — не толькі маці паспяховай вучаніцы, але і кіраўнік заслужанага аматарскага калектыву, узорнага ансамблю танца «Мілавіца» Уваравіцкага цэнтра дзіцячай творчасці Буда-Кашалёўскага раёна.



Фота БелТА.

Дзякуючы запрашэнню на рэспубліканскі «Апошні званок» упершыню выпала магчымасць наведаць Гомель выпускніцы з Гродна Анастасіі Шайко і яе класнаму кіраўніку — настаўніцы Гродзенскай сярэдняй школы № 3 Алене Самасюк. Сёлета Алена Міхайлаўна як класны кіраўнік выпускае свой першы 11 клас, і адразу нечаканая ўзнагарода — на мерапрыемстве педагога ўшанавалі ў намінацыі «Самы класны класны».

— У нашым ваенна-патрыятычным класе 29 самых творчых, таленавітых, найлепшых хлопцаў і дзяўчат. Для мяне шчасце быць іх класным кіраўніком. Вельмі цяжка развітвацца з імі, але ведаю, што ў іх усё атрымаецца. Дзеці выбралі для сябе самыя розныя будучыя прафесіі — вайскоўцаў, супрацоўнікаў праваахоўных органаў, медыкаў. Перакананa, што гэта ўжо гатовыя сапраўдныя патрыёты нашай краіны, — адзначае педагог.

Рады магчымасці пабыць на рэспубліканскім свяце, прысвечаным апошняму званку, удзельнікі алімпіяднага руху — вучні Магілёўскай сярэдняй школы № 33 Максім Фамін і Арына Лапо.

— Мы адны прадстаўляем сваю школу тут на свяце. Але каб нашы аднакласнікі, настаўнікі, бацькі таксама падзялілі з намі гэту радасць, святочную атмасферу, робім шмат фота, здымаем відэа. І так робяць, мяркуем, усе выпускнікі — госці Гомеля. Так што рэальна на рэспубліканскім «Апошнім званку» разам уся краіна, — падзяліліся сваімі ўражаннямі школьнікі з Магілёва.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

ЧАЛАВЕК ПРАЦЫ

# «УВЕСЬ ЧАС ПРЫ СПРАВЕ»

## Адзін з найлепшых механізатараў Кіраўшчыны — пра перавагі жыцця на малой радзіме і матывацыю да прафесійных здзяйсненняў



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Як бы ні развіваліся тэхналогіі, у працы аграрыяў вырашальную ролю і ў трэцім тысячагоддзі адыгрывае чалавечы фактар: вопыт, адказнасць і прафесійная інтуіцыя трактарыста або камбайнера. І так, напэўна, будзе заўсёды. Такая ўжо гэта сфера дзейнасці: з жывымі раслінамі, зямлёй, з непрадказальным і капрызным надвор'ем. Таму ў любой гаспадарцы добрыя механізатары — на вагу золата.**

Ну, а вопыт і інтуіцыя напрацоўваюцца гадамі практыкі. **Механізатар ААТ «Кіраўскі райаграпрамтэхснаб» Уладзімір КОМАР** працуе на палетках раёна з 1999 года. «Калі хочаце пагаварыць з высакакласным прафесіяналам аграрнай сферы, вам — да Уладзіміра Дзмітрыевіча», — параілі нам у Кіраўску. І мы паехалі на поле, якое шчыльна прымыкае да вёскі Пацава Слабада, каб спытаць, што матывуе механізатараў на высокія дасягненні і што вызначае прафесіяналізм.

### НЯМА КАЛІ СТАРЭЦЬ

Пацава Слабада — малая радзіма майго суразмоўцы. Тут ён нарадзіўся, пражыў усё жыццё, тут, на навакольных палях, сеяў хлеб кожную вясну і працаваў на жніве. І ніколі не збіраўся з'язджаць з роднага Кіраўскага раёна. Праўда, з вёскі перабраўся ў райцэнтр.

— У мяне там свой прыватны дом: з аднаго боку — вёска, з другога — горад: зручна, — тлумачыць ён.

Кажа, калі сышло пасляваеннае пакаленне, родная вёска практычна апусцела. А цяпер паступова ажывае. Моладзь прыязджае, купляе дамы.

— Многім падабаецца. Градкі пасадзіў, арэлі паставіў, столік. Шашлыкі пасмажыў, да іх зеляніну на градцы сарваў — любата!

Зрэшты, па лірыку — гэта не да Уладзіміра Дзмітрыевіча: ён — чалавек справы (прычым справы найважнейшай, якая ў прамым сэнсе корміць краіну), і марныя размовы яму не даспадобы.

— За што люблю сваю працу?.. Работа механізатара — 365 дзён у год. У горадзе субота і нядзеля — «усё, у нас выхадныя». Сельскагаспадарчая праца не дае такой магчымасці. У нас сяўба, уборка, зноў пасяўная, восеньская. Затое ўвесь час пры справе. Няма калі сумаваць. І старэць няма калі.

### РУХАВІК ПРАГРЭСУ

Пасяўная для аграрыяў — з году ў год нават больш адказныя дні, чым уборачная. Ад таго, наколькі якасна і ў тэрмін праведзена сяўба, наўпрост залежыць, ці пасяховым будзе жніво. Тэрміны гэтыя дакладна не вызначыць ніводная камп'ютарная праграма: самае сучаснае абсталяванне не можа адмяніць залежнасць сельскагаспадарчых работ ад умоў надвор'я (а яны кожную вясну непаўторныя і часцяком апошнія гады — непрадказальныя). А значыць, усё залежыць ад прафесіяналізму, ведаў і вопыту людзей, занятых на сяўбе, — ад агранома да трактарыста. Сёння пасяўная ўсюды ўжо практычна завершана, але будучы ўраджай патрабуе нястомнага клопату: унясення ўгнаенняў, хімпраполкі, фунгіцыдных апрацовак...

***— З прыходам сучасных тэхналогій працаваць стала лягчэй?***

— Праца — заўсёды праца. Умовы работы — так, сталі значна лепшыя...

Раней у кабіне трактара або камбайна было шумна і пыльна, кажа Уладзімір Комар. Цяпер працаваць камфортна. Але і сёння па-ранейшаму ад трактарыста патрабуецца ўважлівасць і адказнасць. Бо прафесіяналізм механізатара — гэта ў першую чаргу правільнае рэгуляванне абсталявання. Розны рэльеф поля ў пасяўную, розныя культуры ва ўборачную і розная шчыльнасць усходаў на этапе дагляду раслін патрабуюць розных настроек тэхнікі і навяснога абсталявання, а іх нямала. Вядома, значная частка тэхналагічных працэсаў сёння аўтаматызаваная, і ўсё ж многае вырашае і ўвасабляе ў жыццё чалавек, зыходзячы са свайго вопыту, ведаў, таленту.

У актыве Уладзіміра Дзмітрыевіча — медаль «За працоўныя заслугі» і ордэн Пашаны. Ён лічыць, што высокія паказчыкі — вынік «духу спаборніцтва», які прыняты ў механізатараў.

— Калі б не было спаборніцкага духу, нічога б не напрацаваў, — усміхаецца механізатар. — А так — цікава: хочацца зрабіць больш, чым калегі. Думаеш: чаму гэта я не магу? Я ўсё магу! Павінен магчы!

Менавіта дзякуючы гэтай «спаборніцкай» рысцы майму суразмоўцу блізкі спорт.

— Я не рыбак, не паляўнічы, не грыбнік. Я валейбол люблю, — расказвае ён. — У Кіраўску ёсць добрая спартзала, трэніруюся па дзве гадзіны двойчы на тыдзень, калі працоўны графік дазваляе.

Праўда, наракае ён, цяпер няма моцнай каманды:

— Наша пакаленне яшчэ трошкі бегае, а моладзь цяпер акрамя камп'ютараў і тэлефонаў нічога ведаць не хоча...

### «БАЦЬКА СКАЗАЎ — СЫН ЗРАБІЎ»

Падчас уборачнай з году ў год з кабіны трактара Уладзімір перасаджваецца за штурвал камбайна, і яго экіпаж таксама заўсёды сярод лідараў. І ў ранейшыя гады, і сёння прафесія механізатара часам передаецца «ў спадчыну» — ад бацькі да сына. Сям'я Комар — не выключэнне. На камбайне Уладзімір Дзмітрыевіч працуе са старэйшым сынам — Дзмітрыем.

— Працаваць у адным экіпажы з сынам — складана?

— Ну, а што тут складанага? — усміхаецца Уладзімір Комар. — Бацька сказаў — сын зрабіў. Нармальна працуем. Пастаўлена задача, ёсць адказнасць — вось і выконвай.

Працоўныя дынастыі ў аграрнай сферы сёння — не такая ўжо частая з'ява.

— Людзі шукаюць, дзе лягчэй працаваць і зарабляць, і гэта нармальна. Моладзі хочацца ўбачыць нешта новае, пажыць у сталіцы, і гэта таксама зразумела, — разважае ён.

Галоўнае, перакананы Уладзімір Комар, што з часам многія вяртаюцца на вёску. І што ў кожным новым пакаленні знаходзяцца тыя, хто з маладых гадоў вырашае застацца і звязаць свой лёс з малой радзімай.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

НА СЛЫХУ

# КАНТРОЛЬ, ПАДТРЫМКА, МАТЫВАЦЫЯ

## Якія прынцыпы работы з працоўнымі мігрантамі выкарыстоўваюць на птушкафабрыцы «Дружба»

**У Беларусі прыняты ўказ «Аб павышэнні ролі наймальнікаў у галіне знешняй працоўнай міграцыі», які ўзмацняе адказнасць наймальнікаў за замежных работнікаў. Аб узаемадзеянні і ўмовах для працоўных мігрантаў расказаў намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай і арганізацыйна-кадравай рабоце ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» Дзяніс ДАМАРАД.**

На птушкафабрыцы і раней працавалі замежнікі — грамадзяне Расіі, Украіны, Казахстана. Вытворчасць развіваецца, узнікае вялікая патрэба ў кадрах, таму на прадпрыемстве пайшлі па шляху прыцягнення працоўнай сілы з-за мяжы.

— У нас працавалі маладыя людзі з Туркменістана, якія скончылі беларускія ВНУ, у прыватнасці Віцебскую дзяржаўную ветэрынарную акадэмію. Падказалі, што ёсць ахвотныя працаўладкавацца з Туркменістана. Мы агаварылі пэўныя ўмовы і пачалі дзейнічаць у гэтым кірунку. Бралі даныя грамадзян, якія гатовы былі прыехаць, прапрацоўвалі пытанне іх пражывання, знаходжання на тэрыторыі Беларусі, праз міграцыйную службу афармлялі спецыяльны дазвол на працаўладкаванне, натарыяльна засведчвалі і адпраўлялі ў Туркменістан. Яны ўжо афармлялі працоўную візу для перасячэння граніцы і працаўладкавання, — расказаў Дзяніс Дамарад.

У тэрміновых працоўных дагаворах з замежнымі работнікамі прапісаны дадатковыя ўмовы аб прадастаўленні жылля. Службовага ў птушкафабрыкі «Дружба» няма. Пытанне вырашыў з арганізацыямі, на балансе якіх ёсць інтэрнаты. Дагаворы аб арэндзе жылля заключаны з ЖРЭУ горада Баранавічы, Будтрэстам № 25.

— Мы па дагаворы робім у гэтых пакоях рамонт, абстаўляем мэбляй і даём для пражывання нашым замежным работнікам. Аплату за жыллё ўтрымліваем з заробку. У сярэднім дзесьці 10 рублёў за суткі атрымліваецца, — заўважыў намеснік гендырэктара.

Худайберды Каландараў у ліку грамадзян Туркменістана, каго зацікавіла прапанова аб працаўладкаванні ў Беларусі. Дома малады чалавек атрымаў спецыяльнасць «Зваршчык». На «Дружбе» яго адразу на вытворчасці навучылі новай прафесіі — ён працуе апрацоўшчыкам птушкі. Прадпрыемства паклапацілася і пра жыллё. Умовамі мужчына задаволены.

— Нам далі інтэрнат, усё ёсць. На працуніхто не скардзіцца, заробаты хапае, нармальна. Хапае на ежу і на ўсё астатняе, — падзяліўся Худайберды Каландараў. Беларусь яму адкрылася як прыгожая краіна, у якой жывуць прыязныя людзі. На радзіме ў мужчыны засталіся жонка і трое дзяцей. Ён хацеў бы ім паказаць краіну, у якой цяпер працуе.

— У першую чаргу Брэсцкую крэпасць, усім цікава. Лясы ў вас прыгожыя, прырода добрая, паветра чыстае, — пералічыў малады чалавек.

Цяпер на птушкафабрыцы «Дружба» працуюць 38 замежнікаў, з іх 33 — грамадзяне Туркменістана. Атрыманы спецдазволы яшчэ для 11 грамадзян гэтай цэнтральна-азіяцкай краіны. Як толькі яны прыедуць у Беларусь, прадпрыемства адразу ж зоймецца іх працаўладкаваннем.

— У нас стаяла пытанне аб некваліфікаванай рабочай сіле. Гэта грузчыкі, апрацоўшчыкі птушкі. Прафесію апрацоўшчыкаў птушкі атрымліваюць работнікі непасрэдна на вытворчасці, — растлумачыў Дзяніс Дамарад.

Кервен Дурдыеў прыляцеў у Беларусь з Туркменістана ў студзені. Працуе апрацоўшчыкам птушкі ў цэху забою і перапрацоўкі птушкі.

— Прыехаць на заробкі ў Беларусь мяне падштурхнуў недахоп грошай. У сваім родным горадзе я быў настаўнікам музыкі, атрымліваў каля 150 долараў. Утрымліваць дзвюх дачок-школьніц і жонку-студэнтку было вельмі складана. На птушкафабрыцы пасля аплаты падаходнага падатку і жылля атрымліваю дзесьці 2,5 тысячы рублёў, частку пакідаю сабе на жыццё, астатняе адпраўляю родным. Скажу шчыра, задаволены, што трапіў сюды. Умовы працы і заработная плата выдатныя, прадпрыемства выдзеліла месца ў інтэрнаце, на работу з Баранавіч нас возіць службовы аўтобус. Ад цябе толькі патрабуецца добра рабіць даручаную справу і выконваць законы краіны, якая дазволіла працаваць. Калі расказваю сябрам, яны не могуць паверыць, што да працоўных мігрантаў можа быць такое стаўленне, — заваострыў увагу мужчына.

Узровень валодання рускай мовай у замежных працаўнікоў розны. На прадпрыемстве знайшлі спосаб, як паскорыць адаптацыю і нівеліраваць моўны бар'ер.

— Мы сфарміравалі, так бы мовіць, змешаныя брыгады. Напрыклад, у змене ёсць 2-3 чалавекі з Туркменістана, якія добра валодаюць рускай. Праз іх пабудаваны зносіны. Пытанняў вялікіх няма. Мігранты маюць матывацыю вучыць мову, сацыялізуюцца. Нараканняў на іх работу няма, працуюць старанна, па звышурочныя застаюцца, — кажа намеснік кіраўніка птушкафабрыкі.

За некалькі месяцаў можна ўбачыць значныя змены.

— Калі паглядзець на замежніка, які прыйшоў да нас у студзені, і пагутарыць з ім у маі, то розніца істотная. З кожным днём усё больш і больш слоў вывучаюць, — дадаў Дзяніс Дамарад.

Наймальнік адказны і за пражыванне, знаходжанне на тэрыторыі Беларусі працоўных мігрантаў. На «Дружбе» іх каардынуе спецыяліст аддзела кадраў.

— Мы зацікаўлены, каб пражыванне нашых работнікаў было ў рамках заканадаўства. Сістэматычна спецыяліст звязваецца з інтэрнатамі, каб даведацца, як яны жывуць, ці ёсць нейкія пытанні, нараканні. У сацыялізацыі замежнікам дапамагаюць калегі. Адносіны паміж работнікамі партнёрскія. Ніякіх бар'ераў няма. Нашы людзі настроены дапамагчы, падказаць, — рэзюмаваў намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай і арганізацыйна-кадравай рабоце ААТ.

**Паводле БелТА.**



# Мы разам — Беларусь!



Краіна моцная рэгіёнамі: Слуцкі раён

# РАДЗІМА ЗНАКАМІТЫХ ПАЯСОЎ, ГОРАД СА СЛАЎНАЙ ГІСТОРЫЯЙ І ПАТЭНЦЫЯЛАМ

## Чым вабіць людзей старажытны Слуцк?

Больш за тысячу гадоў таму на беразе ракі Случ быў заснаваны адзін з самых старажытных і вядомых гарадоў нашай краіны — Слуцк. Сёння — гэта культурны і моцны прамысловы цэнтр, які прыцягвае не толькі сваёй вонкавай прыгажосцю, але і ветлівасцю, адкрытасцю людзей; горад, у якім пражывае звыш 60 тысяч чалавек, дзейнічае больш як 20 прамысловых прадпрыемстваў. Слуцк славіцца сваёй гісторыяй: найстарэйшая школа, вытанчана вытканыя паясы, подзвіг князёўны Анастасіі, святая Сафія... Але не толькі сваёй багатай гісторыка-культурнай спадчынай вызначаецца Случчына. Падрабязней аб тым, чым сёння жыве рэгіён, карэспандэнтам «Звязды» расказаў старшыня Слуцкага райвыканкама Уладзімір ГОГА.



Фота Лізаветы ГОЛАД.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

***— Уладзімір Леанідавіч, вядома, што Слуцк — гэта не толькі культурны, але і прамысловы цэнтр з моцнай эканомікай. Раскажыце, з якімі вынікамі рэгіён выйшаў у новую пяцігодку?***

— У цэлым за студзень—снежань 2024 года забяспечана выкананне трох мэтавых паказчыкаў: прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця па росце намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы (121,6 % пры прагнозе 111,5 %), сукупных паступленняў даходаў у бюджэт раёна (120,2 % пры прагнозе 109,1 %) і па зніжэнні ўзроўню затрат на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі (работ, паслуг) па арганізацыях, падпарадкаваных мясцовым выканаўчым і распарадчым органам (-7,7 % пры заданні, даведзеным на студзень-верасень 2024 года, -1,9 %).

Вялікая ўвага ў раёне аддаецца павелічэнню сярэдняй заработнай платы работнікаў, адпаведна — і павелічэнню дабрабыту нашых грамадзян. Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў за студзень—снежань 2024-га склала 2029,3 рубля, або 121,6 % да ўзроўню мінулага года, што на 10,1 % вышэй за даведзенае заданне (111,5 %). За снежань 2024-га — 2376,4 рубля, або 122,5 %. Рэальная заработная плата склала 115 % да студзеня—снежня 2023 года. Усімі галінамі эканомікі забяспечаны рост сярэднямесячнай заработнай платы да ўзроўню мінулага года.

Сукупныя паступленні даходаў у бюджэт раёна за 2024 год склаліся на ўзроўні 120,2 % да ўзроўню 2023-га (пры заданні — 109,1 %), у тым ліку падаходнага падатку з фізічных асоб, які пералічваецца ў бюджэт арганізацыямі (за выключэннем асобных катэгорый плацельшчыкаў) — 118,2 % (удзельная вага 71,7 % у сукупных паступленнях даходаў у бюджэт), індывідуальнымі прадпрымальнікамі — 144 % (19,6 %), падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання — 97,6 % (6,1 %), адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб — 96 % (2,6 %).

***— Прамысловасць і сельская гаспадарка — гэта свайго роду лакаматывы эканамічнага росту ў раёне. Што сёння з сябе ўяўляюць індустрыяльны і аграрны комплексы Случчыны?***

— Прамысловы сектар раёна фарміруюць 20 прадпрыемстваў. 8 з іх адносяцца да харчовай і перапрацоўчай галін, на долю якіх прыпадае да 90 % усёй прадукцыі, што выпускаецца ў раёне, 12 — да прадпрыемстваў, якія вырабляюць нехарчовыя тавары. Бюджэтаўтваральнымі з'яўляюцца чатыры прадпрыемствы раёна: ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат», ААТ «Слуцкі цукрарафінадны камбінат», ААТ «Слуцкі мясакамбінат» і ААТ «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў».

За 12 месяцаў 2024 года аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі склаў 2949 млн рублёў, або 117,3 % да 2023-га. Дарэчы, на долю нашага раёна прыпадае 8,7 % абласнога аб'ёму вытворчасці. На долю арганізацый, падпарадкаваных рэспубліканскім органам кіравання, прыпадае 17,1 % прамысловай прадукцыі па раёне; арганізацый, падпарадкаваных мясцовым Саветам дэпутатаў, выканаўчым і распарадчым органам, — 81,4 %, без ведамаснай падпарадкаванасці — 1,5 %.

Акрамя таго, наша Случчына — адзін з найбуйнейшых вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі ў Мінскай вобласці. У склад аграрнага комплексу раёна ўваходзяць 2 унітарныя прадпрыемствы, 9 адкрытых акцыянерных таварыстваў, 4 падсобныя гаспадаркі і 28 фермерскіх гаспадарак. Плошча сельскагаспадарчых угоддзяў складае 111,394 гектара, у тым ліку раллі — 89,8 тысячы гектараў, лугавых — 21,3 тысячы гектараў, садоў — 307,3 гектара. Банітэт сельгасугоддзяў ацэньваецца ў 36,2 бала, раллі — 37,5 бала. Галоўная спецыялізацыя раёна — мяса-малочная жывёлагадоўля, вырошчванне збожжавых, бульбы, цукровых буракоў, лёну і рапсу.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Калі казаць мовай лічбаў, то за 2024 год сельскагаспадарчымі арганізацыямі раёна выраблена валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў супастаўных цэнах на суму 525,7 млн рублёў, або 101,5 % да 2023 года, пры заданні на 2024-ы 101,4 %, у тым ліку прадукцыі раслінаводства на суму 209 млн руб., або 103,7 % да 2023 года, жывёлагадоўлі — 316,7 млн руб., або 100,1 % да 2023-га.

Колькасць буйной рагатай жывёлы на 1 студзеня 2025 года склала 86,9 тыс. галоў (98,5 % да ўзроўню мінулага года), у тым ліку пагалоўе кароў 30,9 тыс. галоў (101 %). Колькасць свіней — 19,2 тыс. (52,8 %), птушкі — 182,6 тыс. (113,2 %).

У 2024 годзе ў сельскагаспадарчых арганізацыях Слуцкага раёна нарыхтавана 16 тыс. тон сена (163 % да ўзроўню мінулага года), 360,6 тыс. тон сенажу (98,9 %), 403,5 тыс. тон сіласу (81,5 %). Па выніках 2024-га сабрана 185 тыс. тон збожжавых і зернебабовых культур (105,9 % да 2023 г.) пры ўраджайнасці 45,4 ц/га (97,4 %), алейнага семя рапсу — 31,2 тыс. тон (128,3 %) пры ўраджайнасці 35,9 ц/га (138,1 %), бульбы — 3,6 тыс. тон (49 %) пры ўраджайнасці 201 ц/га (70 %), цукровых буракоў — 176,9 тыс. тон (86,2 %) пры ўраджайнасці 382 ц/га (87 %).

***— Якія турыстычныя магчымасці сёння ёсць у Случчыны?***

— Слуцк — радзіма знакамітых на ўвесь свет шаўковых залататканых паясоў, якія з'яўляюцца высокамастацкімі творамі ручнога ткацтва. Таму ўсім турыстам раім пабываць у Музеі гісторыі слуцкіх паясоў — нацыянальнай рэліквіі, гістарычнага культурнага сімвала і сучаснага брэнда Беларусі. А яшчэ госці горада нямала цікавага даведаюцца ў Слуцкім краязнаўчым музеі, размешчаным у будынку былога Дома дваранскага сходу. Штогод яго наведваюць дзясяткі тысяч турыстаў.

Асабліва шанаванае месца ў случчан — мемарыяльны комплекс на старых гарадскіх могілках, дзе пахаваны загінулыя падчас Вялікай Айчыннай вайны вайскоўцы і партызаны, а таксама вязні канцэнтрацыйнага лагера.

Акрамя таго, на тэрыторыі раёна знаходзіцца 32 аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, 21 помнік археалогіі, 5 помнікаў гісторыі. У Слуцку захавалася найстарэйшая школа ў Беларусі — ДУА «Гімназія № 1».

У нашым краі шмат храмаў. Гасцей горада прыцягвае набярэжная Случы, дзе знаходзяцца капліца Святой Варвары, помнікі Сафіі Слуцкай і Анастасіі Слуцкай. Сёння актыўнымі тэмпамі набірае папулярнасць вытворчы турызм на такія аб'екты, як РУП «Слуцкія паясы», ААТ «Слуцкі цукрарафінадны камбінат», ААТ «Слуцкі воцатны завод».

Ганаровы статус культурнай сталіцы Беларусі, які горад атрымаў у 2023 годзе, даў нам магчымасць увасобіць у жыццё новыя ідэі па развіцці культурнай прасторы, рэалізаваць найбагацейшы гістарычны патэнцыял старажытнага горада на Случы. Слуцкая зямля — асаблівая, пра яе можна гаварыць бясконца. Яна непаўторная і ўнікальная, як і кожны куток нашай роднай Беларусі. Таму сардэчна запрашаем усіх прычыніцца да гісторыі слаўнай, старажытнай Случчыны! Бо сапраўды: лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць...

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**



# НОВЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ СЛУЧЧЫНЫ

## Як мінімум тры — па праграме «Адзін раён — адзін праект»

З 2022 года ў Беларусі рэалізоўваецца праграма «Адзін раён — адзін праект», ініцыяваная Прэзідэнтам. Яна накіравана на ўмацаванне беларускай эканомікі, а таксама на актывізацыю інвестыцыйнай дзейнасці. Пры рэалізацыі ініцыятыў у рамках гэтай праграмы ў першую чаргу ўлічваецца станоўчы эфект для сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Падрабязней аб ініцыятывах, якія рэалізоўваюцца на Случчыне, карэспандэнтам «Звязды» расказала намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама па эканоміцы Жанна РУЦКАЯ.

«У 2024 годзе ў рэгіёне ажыццяўлялася рэалізацыя трох інвестыцыйных праектаў па прынцыпе «Адзін раён — адзін праект». Першы інвестпраект рэалізоўваецца на базе ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат». У яго рамках запланавана стварэнне інавацыйнай вытворчасці па выдзяленні бычынага лактаферыну метадам іонаабменнай храматаграфіі. Кошт названага праекта — 116 мільёнаў рублёў, тэрмін рэалізацыі — 2023—2027 гг. Рэалізацыя інвестпраекта забяспечыць стварэнне 20 новых працоўных месцаў».

Лактаферын — шматфункцыянальны бялок, які валодае шырокім наборам біялагічных уласцівасцяў: аказвае антымікробнае, антыаксідантнае, супрацьвіруснае, супрацьзапаленчае, супрацьстрэсавае, супрацьпухліннае і імунастымуляцыйнае, супрацьалергічнае дзеянне. Дзякуючы вышэйзгаданым эфектам лактаферын дадаецца ў дзіцячыя малочныя сумесі, напоі, спецыялізаваныя харчовыя прадукты, у тым ліку прадукты спартыўнага харчавання, касметыку, харчовыя і біялагічна актыўныя дабаўкі.

***(Заканчэнне на 12-й стар.)***

Невялікія вытворчыя тэрыторыі, сучаснае абсталяванне і амаль поўная аўтаматызацыя прамысловага працэсу — усё гэта пра маладое і перспектыўнае СТАА «Інтэрферм», якое спецыялізуецца на вытворчасці хлебапякарных дражджэй. Вытворчасць, што функцыянуе ў Слуцку, спалучае сучасныя рашэнні ў сферы энергаспажывання, аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў, нагрузкі на навакольнае асяроддзе, выкарыстання працоўных рэсурсаў і, па сутнасці, з'яўляецца адной з самых перадавых ва Усходняй Еўропе. Больш падрабязна аб тым, чым сёння жыве ўнікальнае прадпрыемства, а таксама аб планах на будучыню карэспандэнтам «Звязды» расказаў дырэктар СТАА «Інтэрферм» Павел Шкатула.



Дырэктар Павел ШКАТУЛА.

# ДЛЯ ЎСІХ ВІДАЎ

## Даведаліся, у чым сакрэт вытворчасці беларускіх дражджэй

### «АБ'ЁМ ВЫТВОРЧАСЦІ ДАЗВАЛЯЕ ЦАЛКАМ ПАКРЫЦЬ ЯШЧЭ ТРЫ ТАКІЯ Ж БЕЛАРУСІ»

Працэс дражджавой вытворчасці заснаваны на размнажэнні дражджэй у вадкіх пажыўных асяроддзях, якія атрымліваюцца з меласы, а яна ў сваю чаргу з'яўляецца адходам ад вырабу цукру. Сёння магчымасці прадпрыемства дазваляюць цалкам задаволіць патрэбы беларускага рынку ў хлебапякарных дражджах высокай якасці і, акрамя таго, экспартаваць гэты від прадукцыі за мяжу, у тым ліку і ў краіны Еўрапейскага саюза, адзначае **кіраўнік прадпрыемства Павел ШКАТУЛА.**

Вытворчыя памяшканні СТАА «Інтэрферм» пабудавалі побач з ААТ «Слуцкі цукрарафінадны камбінат», што досыць лёгка растлумачыць. Камбінат пастаўляе на прадпрыемства меласу — сыравіну для вырабу прэсаваных дражджэй. Гэта пабочны прадукт вытворчасці цукру, або чорная патака. Адначасова ААТ «Слуцкі цукрарафінадны камбінат» выступае адным з заснавальнікаў СТАА «Інтэрферм». Другі заснавальнік і інвестар — нямецкая кампанія «Юніферм», вядомая ў сваёй краіне як вядучы вытворца вадкіх, прэсаваных і гранулляваных дражджэй. Акрамя таго, «Юніферм» — найбуйнейшы еўрапейскі вытворца хлебапякарных дражджэй.

«Беларуска-нямецкае сумеснае прадпрыемства «Інтэрферм» было заснавана летам 2017 года. Сёння мы — найбуйнейшы вытворца дражджэй хлебапякарных прэсаваных. Ініцыятарам такога грандыёзнага праекта выступіў канцэрн «Белдзяржхарчпрам». Тады ж і было прынята рашэнне прыцягнуць замежнага інвестара, каб уключыць яго ў рэалізацыю праекта. Спыніліся на нямецкай кампаніі «Юніферм», якая займае лідзіруючыя пазіцыі па вытворчасці дражджэй у Германіі і ўваходзіць у дзясятку найбуйнейшых у Еўропе».

Перагаворы ішлі некалькі гадоў, у 2011 годзе падпісалі інвестыцыйны дагавор. Тады ж былі пазначаны магутнасці прадпрыемства і тое, якія задачы яно павінна выконваць. «Сёння мы валодаем даволі высокімі магутнасцямі. Наш аб'ём вытворчасці дазваляе цалкам пакрыць яшчэ тры такія жа Беларусі. Адпаведна наша прадукцыя арыентавана на экспарт, асноўная доля якога паступае ў краіны Еўрапейскага саюза і Расію», — паведаміў дырэктар прадпрыемства.

Пачынаючы з 2019 года прадпрыемства працуе на 100-працэнтных магутнасцях. А паколькі завод праектаваўся з магчымасцямі росту, многія праектныя рашэнні разлічаны на значна большую прадукцыйнасць. «Наш патэнцыял дазваляе пашырацца і далей практычна на гэтых жа плошчах. Так, сёлета мы закупілі дадатковую лінію пакавальнага абсталявання ў мэтах павышэння адмоваўстойлівасці. Сёння СТАА «Інтэрферм» працуе ў кругласутачным рэжыме, забяспечваючы ўсе запыты спажыўца», — падкрэсліў Павел Шкатула. Паводле слоў кіраўніка прадпрыемства, сёння тут працуюць 110 чалавек. Гэта малады і амбіцыёзны калектыў сапраўдных спецыялістаў. Сярэдні ўзрост супрацоўніка — 40 гадоў. Штогод першае працоўнае месца на СТАА «Інтэрферм» атрымліваюць маладыя спецыялісты.


Майстар змены ўчастка ўпакоўкі Андрэй ВРАЦКІ на складзе гатовай прадукцыі.

Работа на ўчастку ўпакоўкі.




### АДКУЛЬ ПАЧЫНАЮЦЦА

Дыспетчарская, дзе вырабляюць вадкія дрожджы, — па сутнасці, пульт кіравання, з якога ажыццяўляецца кантроль усяго працэсу падрыхтоўкі дражджэй. Выкарыстанне сучаснага абсталявання і інфармацыйных тэхналогій дазваляе сачыць за кожным этапам вытворчага цыкла па экранах манітораў у анлайн-рэжыме. Інфармацыя даступная не толькі беларускім супрацоўнікам СТАА «Інтэрферм», але і спецыялістам з Германіі, якія ў выпадку форс-мажору прыйдуць на дапамогу.

Больш падрабязна аб працэсе вытворчасці расказаў **майстар участка вадкіх дражджэй Андрэй РЫБАК.** У свой час мужчына скончыў Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію. На прадпрыемстве працуе з моманту яго заснавання. У абавязкі спецыяліста ўваходзіць выраб дражджэй хлебапякарных, а таксама спіртавых. «Пачынаецца працэс з вырошчвання дражджавых культур і заканчваецца пакаваннем гатовага прадукту. На ўчастку ўпакоўкі дрожджы набываюць таварны выгляд, які мы прывыклі бачыць у крамах. На сваім участку мы па сутнасці працуем яшчэ з малекулай. У пэўным асяроддзі харчавання, якое ствараем на сваім участку, маленькія дрожджы павялічваюцца ў аб'ёмах. Пры працэсе ферментацыі мы аддзяляем самі дрожджы ад дражджавога сусла. І толькі тады ўжо атрымліваецца гатовы прадукт, які далей ідзе на ўчастак упакоўкі», — расказаў Андрэй Рыбак.

Разам з ім у змене працуюць яшчэ два аператары. Гаворачы аб працоўным калектыве, мужчына падкрэсліў высокія працоўныя і асабістыя якасці супрацоўнікаў: «На нашым участку дружны, згуртаваны калектыў.






# ВЫПЕЧКІ!

## і за што іх любіць спажывец

INTERFERM



Майстар участка вадкіх дражджэй Андрэй РЫБАК разам з апаратчыкамі вырошчвання дражджэй Уладзімірам БАРСУКОВЫМ і Яўгенам СЯЧКО кантралююць працэс вырошчвання дражджэй.



Ёмістасці для захоўвання вадкіх дражджэй.

## «СТРОГІ ПАДЫХОД ДА КАНТРОЛЮ ЯКАСЦІ ДАЗВАЛЯЕ РЭАЛІЗОЎВАЦЬ НАШУ ПРАДУКЦЫЮ Ў КРАІНЫ ЕЎРАСАЮЗА»

На прадпрыемстве вядзецца пастаянны жорсткі кантроль якасці прадукцыі на ўсіх этапах вытворчасці дражджэй, уключаючы кожную партыю прадукту. СТАА «Інтэрферм» сертыфікавана і адказвае ўсім патрабаванням сістэм менеджменту якасці: FSSC 22000; ISO 9001:2015; HALAL; IFS Food version 6.1: «Мы праходзім штогадовую ацэнку, пры гэтым заўсёды закрываем сертыфікацыю з высокімі баламі. Гэта сведчыць аб высокім узроўні ўкаранення сістэм якасці на прадпрыемстве. У цэлым наяўнасць гэтых сістэм і строгі падыход да кантролю якасці дазваляе рэалізоўваць нашу прадукцыю ў краіны Еўрасаюза», — падзяліўся меркаваннем дырэктар.

А яшчэ тут — закрыты цыкл вытворчасці. Гэта дазваляе забяспечыць максімальную чысціню вытворчасці. Да ўмоў захоўвання і транспарціроўкі таксама прад'яўляюцца досыць строгія патрабаванні па тэмпературным рэжыме. Акрамя таго, на прадпрыемстве кожная партыя праходзіць абавязковы кантроль у вытворчай лабараторыі. На працягу ўсяго тэрміну прыдатнасці тут захоўваюць узоры ўсіх выробленых партый.

Як адзначыў Павел Шкатула, на СТАА «Інтэрферм» устаноўлена найноўшае вытворчае абсталяванне сусветнага ўзроўню. Такое рэдка сустрэнеш не тое што ў Беларусі, але і ва ўсёй Усходняй Еўропе. Устаноўкі і лініі адказваюць самым высокім патрабаванням у сферах энергаспажывання, аўтаматызацыі працэсаў, нагрузкі на навакольнае асяроддзе і выкарыстання працоўных рэсурсаў.

У далейшых планах, вядома, — пашырэнне. «У нас ёсць праграма нарошчвання магутнасцяў, праграма па закупцы пэўнага віду абсталявання. На жаль, санкцыйныя абмежаванні могуць унесці свае карэктывы. Але пры гэтым мы не стаім на месцы і ўпэўнена крочым у нагу з часам! Толькі ў гэтым годзе мы закупілі новую ўпаковачную лінію, дадатковую паветранадзімалку, элементы выпарной устаноўкі. На адным месцы стаяць дакладна не збіраемся. Далей — больш», — падагульніў Павел Шкатула.

## НАЙЛЕПШЫЯ СУАДНОСІНЫ ЦАНЫ І ЯКАСЦІ

Кантроль якасці на СТАА «Інтэрферм» праводзіцца на ўсіх стадыях тэхналагічнага працэсу. На прадпрыемстве нават ёсць свая вытворчая лабараторыя, якая складаецца з аналітычнага і мікрабіялагічнага аддзелаў. Яе супрацоўнікі правяраюць кансістэнцыю, колер, знешні выгляд, аналітычныя паказчыкі. Аб гэтым нам расказала **інжынер-хімік Таццяна ВАРАШКЕВІЧ:** «Сёння ў нашым аналітычным аддзеле працуюць два чалавекі. Яны выробляюць кантроль прадукцыі на ўсіх этапах тэхналагічнага працэсу, правяраюць колер, кансістэнцыю, пад'ёмную сілу дражджэй. Таксама тут ажыццяўляецца кантроль вады для патрэб вытворчасці. У мікрабіялагічным аддзеле таксама працуюць два чалавекі. Яны займаюцца даследаваннем мікрабіялагічных паказчыкаў дражджэй. У нашай вытворчай лабараторыі выкарыстоўваецца толькі сучаснае абсталяванне, якое дазваляе найбольш дакладна ажыццяўляць кантроль якасці».



Інжынер-хімік Таццяна ВАРАШКЕВІЧ вызначае жорсткасць катлавой вады ў вытворча-аналітычнай лабараторыі.

Сёння СТАА «Інтэрферм» выпускае некалькі відаў запатрабаванай спажыўцамі прадукцыі. Сярод іх — дрожджы хлебапякарныя прэсаваныя «Актыва». Яны ідэальна падыходзяць для выпечкі здобных, пшанічных, жытнёва-пшанічных і жытніх вырабаў. Сакрэт у тым, што спецыяльны штам дражджэй, які выкарыстоўваецца пры іх вырабе, дазваляе забяспечыць максімальную пад'ёмную сілу для ўсіх відаў цеста. Гэта павялічвае дабаўленую вартасць іх уласнай прадукцыі. Лёгкасць і водар выпечкі пры выкарыстанні дражджэй СТАА «Інтэрферм» прыцягваюць пакупнікоў і ў крамах. Выробляе прадпрыемства таксама дрожджы спіртавыя прэсаваныя «Хмельная Паляна». Яны патрэбны для вырабу напояў закісання. На экспарт у еўрапейскія краіны сыходзяць дрожджы «Экаферм» і «Профіферм».

Еўрапейскія рынкі беларускі тавар заваяваў найлепшымі суадносінамі цаны і якасці. Патанняць прадукцыю атрымліваецца дзякуючы цэнам на сыравіну, яе спрыяльнай лагістыцы, выгаднаму кошту энергарэсурсаў, упаковачных матэрыялаў, якія, дарэчы, на 80 % айчынныя. Усё разам гэта дазваляе беларускай прадукцыі атрымліваць канкурэнтную перавагу.

Акрамя таго, СТАА «Інтэрферм» пашырае ўласны парк грузавых машын. «Маладое, але сапраўды перспектыўнае прадпрыемства, сёння мы ўпэўнена крочым у нагу з часам, цалкам забяспечваючы патрэбы свайго спажыўца. Сакрэт нашага поспеху — у згуртаваным калектыве аднадумцаў, прафесіяналах сваёй справы, якія і днём, і ноччу працуюць на карысць любімай Беларусі. На дасягнутых выніках мы дакладна спыняцца не станем. Далей — больш», — упэўнены кіраўнік прадпрыемства Павел Шкатула.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 690655013

## БЕЛАРУСКІЯ ДРОЖДЖЫ?

Усе — прафесіяналы сваёй справы, якія працуюць з моманту заснавання прадпрыемства».

Наступнае памяшканне, у якое трапляем, — дыспетчарская ўпакоўкі. Тут можна назіраць увесь працэс ад выхаду гатовых дражджэй для іх сушкі на спецыяльныя барабаны да прасоўкі ў брыкеты і ўпакоўкі спачатку ў спецыяльную плёнку або цэлафан, а затым — у скрынкі. «Экаферм», «Профіферм», «Актыва», «Хмельная Паляна» — для кожнага з рынкаў дражджавая прадукцыя выходзіць пад сваёй асаблівай назвай.

Аб гэтым расказаў **майстар участка ўпакоўкі Андрэй ВРАЦКІ,** які працуе на прадпрыемстве з пачатку яго заснавання. Да гэтага ён вывучаў вопыт вытворчасці дражджэй у Германіі. У яго падначаленні —змена з 10 чалавек. Яны з вадкіх дражджэй ствараюць, па сутнасці, ужо гатовы прадукт: «Задача нашага ўчастка —ператварыць вадкія дрожджы ў брусок сухіх дражджэй, якасна запакаваць ужо гатовы прадукт. У нас знаходзіцца стэрыльная для вытворчасці дражджэй зона. Вадкія дрожджы праходзяць праз устаноўленыя фільтры, дзе прыбіраецца 30 % вадкасці. Затым работнікі вытворчай лабараторыі правяраюць якасць упакаваных дражджэй. Акрамя таго, на нашым участку дрожджы праходзяць праз металадэтэктары, каб выключыць трапленне ў іх старонніх рэчываў. Затым правераны тавар адпраўляецца на склад гатовай прадукцыі, дзе падтрымліваецца пастаянная тэмпература ў плюс два градусы. Каб не парушыць тэмпературны рэжым, нават машыны пад загрузку заязджаюць сюды праз спецыяльныя герметызатары».



Вядучы спецыяліст аддзела збыту Вікторыя СЯРЖАНТАВА дэманструе макет прадпрыемства.

# ДУШЭЎНА. СМАЧНА. ДЛЯ СЯМ'І



## Даведаліся, што хаваецца за хрумсткай скарыначкай і дзіўным водарам слуцкага хлеба



Спецыяліст па кадрах Святлана САЛАВЕЙ з узнагародамі прадпрыемства.

**ААТ «Слуцкі хлебазавод»** — гэта кампанія з больш чым паўвекавой гісторыяй, якую ўзначальвае Дзмітрый ЧЫРЭЦ. Правільнае спалучэнне сучасных тэхналогій і шматвяковых традыцый з творчым і добрасумленным стаўленнем да любімага занятку — вось сакрэт каманды. Прадукцыя, якая выпускаецца на заводзе, шырока вядомая не толькі ў сваім рэгіёне, але і ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці і за яе межамі. Заўсёды свежы хлеб, які выпякаюць на прадпрыемстве, прыносіць дому асаблівую атмасферу ўтульнасці і дабрабыту. Багаты асартымент прадукцыі, індывідуальны падыход да кліента, гнуткія цэны і скідкі, паказ узораў прадукцыі, добрасумленнасць і своечасовасць выканання дагаворных абавязкаў — асноўныя прынцыпы партнёрства гэтага перадавога прадпрыемства.




Цеставод Зоя ГНЕДЗЯНКОВА наразае багеты для сухароў.

## ПРА АЎТАРЫТЭТ ГАВОРАЦЬ ЛІЧБЫ

Аўтарытэт прадпрыемства заўсёды ствараецца на аснове вынікаў яго дзейнасці, поспехаў і дасягненняў. А яны ў сваю чаргу забяспечваюцца прафесіяналізмам работнікаў. «Па выніках работы за студзень—снежань 2024 года аб'ём вытворчасці ў натуральным выражэнні хлебабулачных вырабаў склаў 17 739 тон (118,1 %); кандытарскіх вырабаў — 1127 тон (108,4 %), — прыводзіць статыстыку **галоўны эканаміст прадпрыемства Павел ШУБА.**

Паводле яго слоў, сярэдняспісачная колькасць працоўных за студзень—снежань 2024-га склала 417 чалавек. У параўнанні з 2020 годам яна ўзрасла на 27,5 %, або плюс 90 чалавек.

За 2024 год праведзена работа па распрацоўцы, асваенні і абнаўленні асартыменту новымі відамі прадукцыі. Распрацавана і асвоена 8 найменняў хлебабулачных і 4 найменні кандытарскіх вырабаў. Сярод іх — хлеб «Рапсавы мікс»; булка посная з карыцай; сухары «Ішла Саша» з водарам ванілі; сухары здобныя малочныя; кекс «Шока-кропля», кекс з цукатамі, сухары-грэнкі пшанічныя «Брускета» са смакам «Вяленыя таматы з італьянскімі травамі»; сухары-грэнкі пшанічныя «Брускета» са смакам «Італьянскі казіны сыр з водарам яблыка»; сухары-грэнкі пшанічныя «Брускета» са смакам «Калабрыйская цыбуля з цвёрдым сырам»; сухары-грэнкі пшанічныя «Брускета» са смакам «Сыр пармезан».




## «ДЛЯ НАС ВАЖНА, КАБ КОЖНАЯ БУЛКА, КОЖНЫ ТОРТ СТАЎ ЧАСТКАЙ ВАШЫХ СЯМЕЙНЫХ ГІСТОРЫЙ»

Хлеб — больш чым прадукт. Гэта гісторыя, якую нашы продкі пяклі ля пячы, сакрэт, які перадаецца з пакалення ў пакаленне. «Сёння мы, як захавальнікі гэтых традыцый, злучаем старадаўнія рэцэпты з сучаснымі тэхналогіямі. Але галоўнае ў нашай рабоце застаецца нязменным: мы выпускаем толькі тое, што з гонарам паставілі б на свой стол. «Вырабляем тое, што любім самі» — не дэвіз, а правіла, якое аб'ядноўвае ўсю каманду Слуцкага хлебазавода. Для нас важна, каб кожная булка, кожны торт стаў часткай вашых сямейных гісторый», — сцвярджае **Алена ШАХНЕР, вядучы маркетолаг прадпрыемства.** Яна расказала пра унікальную прадукцыю прадпрыемства, якую так любяць спажыўцы з усёй краіны.

**Галоўны герой стала — батон «Для вашай сям'і».** «Пачнём з легенды. Батон у ярка-чырвонай упакоўцы — візітная картка Слуцкага хлебазавода. Яго водар, знаёмы з дзяцінства, мяккая скарыначка і бязважкі мякіш пакарылі тысячы сем'яў. «Для вашай сям'і» — не проста назва, а абяцанне: мы ўкладваем у гэты батон столькі ж клопату, колькі ў хлеб для ўласнага дому. Менавіта таму ён дзесяцігоддзямі застаецца хітом продажаў, — тлумачыць Алена Шахнер. — **Лінейка «Будзьце здаровыя» — наш адказ тым, хто шануе карысць і смак.** Тут «пануе» **хлеб «Фітнес»** — з насеннем лёну, гарбуза, сланечніку і спельтавай мукой. Выпускаецца з мая 2018 года і карыстаецца ўстойлівым попытам. Першапачаткова выраблялі каля трох тон у месяц, цяпер аб'ёмы выраслі ў дзясяткі разоў! А для **аматараў жытняй класікі мы стварылі «Фітнес плюс жытні».**

Паводле слоў вядучага маркетолага, у лінейцы прадпрыемства попытам карыстаюцца **хлябы «Рапсавы мікс»** — з семем рапсу, лёну і гарбуза; **«Палявы з ільном»** — з семем лёну і зернем сланечніку, пшаніцы, аўса, кукурузы і панцаку; **«Бялковы з вотруб'ем»** — з высокім утрыманнем харчовых валокнаў.

Навінка мая 2025 года — **хлеб «Шпінатны»!** У яго складзе: семкі гарбуза, лёну, кунжут, а таксама сумесь натуральных спецый — шпінат, базілік, арэгана, часнок. Як адзначыла Алена Шахнер, гонар прадпрыемства — поўнасцю жытнія хлябы, якія рэдка сустрэнеш у іншых вытворцаў, **«Чыста жытні цуд» і «Жытні з семкамі».**



Пекар Марына ДОЛБІК і брыгадзір Дзмітрый ЛОГІШ фармуюць кексы.



## ПРЫСМАКІ, ЯКІЯ ДОРАЦЬ РАДАСЦЬ. ХРУСТ, ЯКІ АБ'ЯДНОЎВАЕ

«Многія нашы тарты спакаваныя ў кардонную скрынку са стужкай «Слуцкі каравай», нібы гатовы падарунак. **Торт «Слуцкі Смак» — наш кандытарскі шэдэўр»,** — падкрэслівае Алена Шахнер. Мядовы бісквіт са сметанковым начыннем даўно стаў фаварытам святочных сталоў. Але гэта не адзіная зорка: **торт «Кіеўскі па-новаму»** — пяшчотна-арахісавыя каржы са сметанковым крэмам; **«Казка»** — бісквітны рулет з далікатным сметанковым крэмам; **«Сафія»** — бісквіт з чарнаслівам і сметанковым крэмам. А яшчэ — **кекс з разынкамі,** які верне вас у дзяцінства. Салодкі, з вялікай колькасцю разынак, ён выпякаецца па рэцэпце, які не мяняўся дзесяцігоддзямі. «Як у бабулі», — менавіта так кажуць пра яго пакупнікі.

**Сухарыкі Ringas** — прыклад таго, як перавагі спажыўцоў становяцца нашымі хітамі. Іх унікальнасць — у тэхналогіі без абсмажвання ў фрыцюры, што захоўвае карысць і хруст. Сёння мы выпускаем сухарыкі Ringas са смакам смятаны і зеляніны, сыру, белых грыбоў са смятанай і таксама баварскіх каўбасак», — працягвае Алена Шахнер.

Пра якасць прадукцыі і любоў спажыўца да ААТ «Слуцкі хлебазавод» красамоўна гавораць шматлікія ўзнагароды. У 2025 годзе Слуцкі хлебазавод узяў Гран-пры на «Кандытарскім Алімпе» за торт «Слуцкі Смак»; торт «Сафія»; пернікі «Навінка» з лімонам. Залатыя медалі атрымалі печыва «Зерневае з марской соллю» і кексы «З шока-кропляй» і з разынкамі. Але галоўныя ўзнагароды — водгукі спажыўцоў: «Ваш батон — як з дзяцінства!»; «Кекс з разынкамі — любімы сняданак дзяцей»; «Сухарыкі — абавязковыя ў нашых паходах».

Азнаёміцца з асартыментам прадукцыі хлебазавода можна на сайце slhleb.by; заказных тартоў — на каравай.бел; салёных сухарыкаў — на сухарики.бел. Там і шмат іншай карыснай інфармацыі: сцэнарыі свят, рэцэпты (у якіх выкарыстоўваецца прадукцыя хлебазавода). Актыўна вядуцца і сацсеткі **@slucki.karavai:** у Instagram, «ВКонтакте», Tiktok, YouTube.

***Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ, Алена ДАЎЖАНОК.***
**Фота Лізаветы ГОЛАД і з архіва прадпрыемства.**

УНП 600154157

# РАЗВІЦЦЁ Ў НАГУ З ЧАСАМ



Казлавы кран прадпрыемства ў Рэчыцы.




**Якасная прадукцыя, перадавыя тэхналогіі, сучаснае абсталяванне і дружны калектыў — усё гэта пра ААТ «Кранавы завод». Прадпрыемства, якое выпрабляе грузапад'ёмную тэхніку любой складанасці і аказвае сваім кліентам поўны цыкл паслуг ад распрацоўкі ідэі да дастаўкі і мантажу. Чым прывабная яго прадукцыя і як прадпрыемству ўдалося стаць цэнтрам прыцягнення маладых і таленавітых кадраў?**







Дырэктар Мікалай АНЦІПАЎ.

## ЯКАСЦЬ І СЭРВІС

Сёння канкурэнцыя на рынку вельмі высокая. І для таго, каб выйграць тэндар на закупку, неабходна прыкласці сапраўды нямала намаганняў. У чым жа адметнасць ААТ «Кранавы завод»?

— Па-першае, мы — прадпрыемства поўнага вытворчага цыклу. Робім усё: ад распрацоўкі тэхналагічнай дакументацыі да поўнага выпрабу з максімальнай лакалізацыяй. Па-другое, гэта якасць выпрабленага прадукту і сэрвіс. Мы аператыўна вырашаем усе праблемы, што ўзнікаюць. Гэта асноўныя крытэрыі, якія дазваляюць працаваць на рынку, — падзяліўся **дырэктар ААТ «Кранавы завод» Мікалай АНЦІПАЎ.**

Развіваецца прадпрыемства даволі паспяхова. Пра гэта гаворыць статыстыка. Так, паводле даных за мінулы год, пры плане 47 млн таварнага выпуску кранавага абсталявання выйшла 48 млн. У 2025-м тут плануюць дасягнуць планкі ў 54 млн таварнага выпуску.

— Работы ў нас дастаткова. Цяпер на тэрыторыі Беларусі вялікі парк старога абсталявання, якое патрабуе замены. За мінулы год аб'ём выпуску прадукцыі ў адносінах да папярэдняга быў павялічаны ў 1,6 раза, — адзначыў Мікалай Анціпаў.

Таксама па словах дырэктара, апошнім часам сталі вельмі запатрабаванымі казлавыя краны. Таму, нягледзячы на складанасць вытворчасці, тут іх выпускаюць практычна штомесяц у адпаведнасці з попытам на рынку.

— Пастаянна сумесна з «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГАМ», у склад якога ўваходзім, вядзём работы па замене імпартных камплектуючых. Стараемся максімальна лакалізаваць увесь працэс выпрабу кранаў, каб усё было беларускае, — падзяліўся дырэктар ААТ «Кранавы завод».

Адным з апошніх праектаў гэтага года стала поўнае аснашчанне вытворчасці МАЗа грузапад'ёмным абсталяваннем.

Характэрна і тое, што прадукцыя прадпрыемства таксама актыўна ідзе на экспарт. Асноўныя кліенты ў Расіі. Аднак апошнім часам тут прапрацоўваюць яшчэ і рынак Казахстана.

## ПАСТАЯННАЯ МАДЭРНІЗАЦЫЯ

У сувязі з ростам попыту на прадукцыю прадпрыемства на яго абсталяванне прыпадае вялікая нагрузка. Менавіта таму важна своечасова абнаўляць матэрыяльна-тэхнічную базу.

— Мы актыўна займаемся мадэрнізацыяй, набываем сучаснае зварачнае абсталяванне. У нас акрэдытаваная лабараторыя, якая праводзіць стапрацэнтны кантроль якасці. Туды таксама рэгулярна набываем абсталяванне. Цесна працуем з Дзяржпрамнаглядам і з Цэнтрам сертыфікацыі для таго, каб на выхадзе атрымаўся гарантавана якасны прадукт, — расказаў Мікалай Анціпаў.

Акрамя таго, ААТ «Кранавы завод» ужо атрымала першы сертыфікат на выраб электрычнай талі.

— Ёсць план да 2030 года поўнасцю асвоіць вытворчасць талі, каб выкарыстоўваць яе ўзамен набытай з-за мяжы, — падзяліўся дырэктар прадпрыемства.

Усім вядома, што сучаснае абсталяванне самым непасрэдным чынам уплывае на якасць прадукцыі. Аднак Мікалай Анціпаў перакананы яшчэ і ў тым, што своечасовая мадэрнізацыя — гэта гарантыя паспяховага замацавання маладых і таленавітых кадраў.

— Плануем да канца года абнавіць металаапрацоўчае абсталяванне. Старыя такарныя станкі будзем замяняць паўаўтаматамі, у тым ліку для таго, каб прыцягнуць моладзь да гэтай справы. Наўрад ці ў маладога токара будзе матывацыя старанна працаваць на старым станку. Цяпер іншы час, і вельмі важна крочыць з ім у нагу. Будзе сучаснае абсталяванне — будуць людзі працаваць, — заключыў дырэктар прадпрыемства.





Электрагазазваршчык Аляксандр ФРАЛОЎ зварвае часткі крана.

## ПРАЦУЕ МОЛАДЗЬ

Характэрна і тое, што ААТ «Кранавы завод» — самае «маладое» прадпрыемства Міністэрства прамысловасці. Сярэдні ўзрост работнікаў тут — 38 гадоў. Адна трэць супрацоўнікаў — ва ўзросце да 31 года.

— Стараемся максімальна прыцягваць моладзь, таму што ад яе залежыць, куды мы будзем ісці далей. На дадзены момант ААТ «Кранавы завод» вельмі прывабнае месца работы. Гэта стабільнае прадпрыемства, якое дынамічна развіваецца і забяспечвае дастойную заробтную плату, — падзяліўся дырэктар Мікалай Анціпаў.

Акрамя таго, моладзь імкнуцца заахвочваць і дадатковымі матэрыяльнымі бонусамі. Калі спецыяльнасць уваходзіць у пералік асабліва важных для прадпрыемства, то пасля заканчэння адпрацоўкі і падпісання новага кантракта на 5 гадоў работнік можа разлічваць на выплату ў памеры 125 базавых велічынь.

— Дастаткова важкі стымул у фінансавых адносінах — гэта забеспячэнне жыллём. У нас ёсць камфартабельныя інтэрнаты блокавага тыпу. Але ў некаторых выпадках здымаем за кошт прадпрыемства і кватэры для сем'яў, — адзначыў Мікалай Анціпаў.

Важна і тое, што кіраўніцтва імкнецца стварыць максімальна камфортнае асяроддзе для сваіх супрацоўнікаў.

— Добраўпарадкаваннем займаемся ўжо пяты год у актыўным рэжыме. Мы прывялі ў поўны парадак усе бытавыя памяшканні: душавыя, гардэробныя, санвузлы... Актыўна добраўпарадкоўваем унутраную тэрыторыю, — падзяліўся дырэктар прадпрыемства.

Уражвае і насычанае грамадскае жыццё. Турыстычныя злёты, спартыўныя і культурныя мерапрыемствы, разнастайныя акцыі. Таксама кіраўніцтва прадпрыемства лічыць неабходным укладвацца ў навучанне і павышэнне кваліфікацыі кадраў. Закранае гэта ўсіх: пачынаючы ад рабочых спецыяльнасцяў і заканчваючы бухгалтарамі, эканамістамі і юрыстамі.

Тут ёсць шмат магчымасцяў для ўсебаковага развіцця — было б жаданне самога супрацоўніка. Так, **начальнік цэха па выпрабе грузапад'ёмнага абсталявання Павел КІРШЧЭНЯ** на прадпрыемстве амаль чатыры гады. Да дэкрэтнага водпуску бухгалтарам на заводзе працавала яго жонка Валерыя. Сам Павел пачынаў з простага слесара і паступова дайшоў да сваёй цяперашняй пасады. На дадзены момант пад яго кіраўніцтвам знаходзіцца больш за 140 чалавек.

— Умовы працы камфортныя, заработная плата годная, калектыў малады і дружны. Работа адказная і карпатлівая, але разам з тым вельмі цікавая, — падзяліўся ён.

Уклад прадпрыемства і яго супрацоўнікаў у эканоміку раёна па заслугах адзначаюць на розных узроўнях. Так, на Дошцы гонару Слуцкага раёна па выніках працы за 2024 год была размешчана фатаграфія начальніка тэхналагічнага бюро Алены Кляшчук. А дырэктар прадпрыемства Мікалай Анціпаў адзначаны ганаровай граматай Міністэрства прамысловасці за шматгадовую добрасумленную працу і высокі прафесіяналізм.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**



Калектыў цэха па выпрабе грузапад'ёмнага абсталявання. Злева направа: электрагазазваршчыкі Дзмітрый КУДРАВЕЦ, Аляксей КАЛЯНКОВІЧ, Яўген УНЯМІН, Віталь ДУБОВІК, Міхаіл РУДЗІН, слесар Ілья ДАВІДОВІЧ, начальнік цэха Павел КІРШЧЭНЯ, слесар Аляксандр ПРАКОПЧЫК, электрагазазваршчыкі Максім ДРОБЫШ, Барыс ЧАРНАВУС і газаэлектразваршчык Ілья СЦЕПАНОВІЧ.

УНП 600154185

# НОВЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ СЛУЧЧЫНЫ

(***Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.***)

Праект з'яўляецца імпартазамяшчальным і экспартаарыентаваным (95 % прадукцыі плануецца пастаўляць на рынкі Расійскай Федэрацыі і азіяцкіх краін), а таксама дазволіць Рэспубліцы Беларусь быць першай сярод краін постсавецкай прасторы ў вытворчасці бычынага лактаферыну, забяспечыць больш глыбокую перапрацоўку складовых кампанентаў малака і атрыманне дадатковага прыбытку.

Яшчэ адзін праект сёння рэалізоўваецца на базе ААТ «Слуцкі мясакамбінат». Паводле слоў намесніка старшыні Слуцкага райвыканкама, ён уяўляе сабой інавацыйны працэс вытворчасці мясных буйнакавалкавых паўфабрыкатаў з палепшанымі спажывецкімі характарыстыкамі з ужываннем тэхналогіі папярэдняга шокавага ахаладжэння. Кошт праекта — 22,1 мільёна рублёў, а тэрмін яго рэалізацыі — 2023—2028 гады. У выніку плануецца мадэрнізаваць 23 працоўныя месцы.

Прымяненне шокавага ахаладжэння мяса забяспечыць захаванне яго якасці і скарачэнне страт усушкі мяса на 22 %, што дазволіць павялічыць выпуск канкурэнтаздольнай імпартазамяшчальнай прадукцыі. Гэта тэхналогія з'яўляецца інавацыйнай, а праект —экспартаарыентаваным. Палепшаныя якасныя паказчыкі прадукцыі дазволяць прадпрыемству асвоіць новыя рынкі збыту (краіны Азіі і Каўказа), а таксама павялічыць пастаўкі на экспарт ва Узбекістан, Казахстан, Расійскую Федэрацыю, Кітай, такім чынам павялічыцца ўдзельная вага адгружанай інавацыйнай прадукцыі і доля валютнай выручкі.

Рэалізацыя праекта таксама дасць магчымасць стварыць бяспечныя ўмовы працы персаналу падчас абслугоўвання аміячных халадзільных установак, забяспечыць ахову навакольнага асяроддзя, знізіць аміякаёмістасць усёй сістэмы з 55 да 4 тон і расход электрычнай энергіі да 30 %.

«У лістападзе 2024 года завершана рэалізацыя трэцяга праекта па прынцыпе «Адзін раён — адзін праект». Так, на ААТ «Слуцкі хлебазавод» закончана рэканструкцыя вытворчага корпуса з устаноўкай хлебапякарнай печы. Фактычны кошт праекта склаў 6,6 мільёна рублёў пры заданні плана 5,8 мільёна. У выніку на прадпрыемстве створана 22 новыя працоўныя месцы. За ўвесь перыяд рэалізацыі праекта асвоена інвестыцый на суму 5,5 мільёна рублёў пры плане 4,8 мільёна, або 114,6 % да плана», — паведаміла Жанна Руцкая, дадаўшы, што асноўная мэта праекта — павышэнне эканамічнай эфектыўнасці дзейнасці прадпрыемства за кошт стварэння новых вытворчых магутнасцяў, што дазволіць павялічыць прадукцыйнасць абсталявання і, як вынік, аб'ём вытворчасці хлебабулачнай прадукцыі.

Таксама ў лютым 2024 года завершаны значны для развіцця сельскагаспадарчага комплексу Слуцкага раёна праект па рэканструкцыі птушкагадоўчага комплексу ААТ «Смалявічы бройлер» коштам 16,6 мільёна рублёў, а ў лістападзе — 2 значныя інвестыцыйныя праекты. «Мы завяршылі ўзвядзенне адміністрацыйна-вытворчага корпуса на базе РУП «Слуцкія паясы» коштам 15,8 мільёна рублёў, а таксама будаўніцтва буйнога жывёлагадоўчага комплексу ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» у вёсцы Квасынічы на 2000 галоў. Кошт гэтага праекта склаў 22,9 мільёна рублёў», — падагульніла Жанна Руцкая. Намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама падкрэсліла: на гэтым работы не спыняцца.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА РАЗМЕЩЕНИЕ СРЕДСТВА РЕКЛАМЫ, в том числе средства наружной рекламы, на государственном недвижимом имуществе (земельные участки, относящиеся к землям общего пользования) в г. Гродно 24 июня 2025 года

| № п/п | Адрес места и срок размещения средства наружной рекламы | Тип технического средства | Количество конструкций (единиц) | Количество сторон (плоскостей) | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Пучкова, на территории, прилегающей к зданию № 36, сроком на 3 года | рекламная флаговая конструкция (1мх3м) | 1 | 1 | 90,72 | 90,72 |
| 2 | ул. Победы, на территории, прилегающей к зданию № 47, сроком на 3 года | рекламные флаговые конструкции (1,1мх5м) | 4 | 4 | 665,28 | 665,28 |
| 3 | ул. Белуша, на прилегающей территории, сроком на 3 года | рекламная двусторонняя щитовая конструкция (6мх3м) | 1 | 2 | 647,74 | 647,74 |
| 4 | ул. Лиможа, остановочный пункт транспорта общего пользования «Средняя школа № 36», территория, прилегающая к жилому дому № 28 по ул. Курчатова, сроком на 3 года | специализированные средства наружной рекламы, совмещённые с остановочным навесом (замена остановочного навеса) | 1 | 3 | 142,10 | 142,10 |
| 5 | ул. Дзержинского, остановочный пункт транспорта общего пользования «Гродноoблнефтепродукт», территория, прилегающая к жилому дому № 27 по ул. Курчатова, сроком на 3 года | специализированные средства наружной рекламы, совмещённые с остановочным навесом (замена остановочного навеса) | 1 | 3 | 142,10 | 142,10 |
| 6 | ул. Курчатова, остановочный пункт транспорта общего пользования «Гродноoблнефтепродукт», территория, прилегающая к зданию № 96 по ул. Дзержинского, сроком на 3 года | специализированные средства наружной рекламы, совмещённые с остановочным навесом (замена остановочного навеса) | 1 | 3 | 142,10 | 142,10 |
| 7 | Бульвар Ленинского Комсомола, остановочный пункт транспорта общего пользования «Форты», территория, прилегающая к жилому дому № 43, сроком на 3 года | специализированные средства наружной рекламы, совмещённые с остановочным навесом (установка остановочного навеса) | 1 | 3 | 142,10 | 142,10 |
| 8 | проспект Румлевский, на территории, прилегающей к зданию № 81 по проспекту Космонавтов, сроком на 7 лет | мультимедийная рекламная конструкция (рекламный светодиодный экран) | 1 | 2 | 690,61 | 690,61 |

Аукцион состоится **24 июня 2025 года** в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, телефоны: 8 (152) 626055, 626056

Задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению не позднее **18 июня 2025 года** (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов задаток вносится для каждого из предметов аукциона), на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить на расчетный счет, указанный в протоколе о результатах торгов, сумму средств, за которую продан предмет торгов, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору торгов затраты на их организацию и проведение.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина 2/1, кабинет № 117, в рабочие дни с 8.00–13.00 и 14.00–17.00 **с 26 мая по 18 июня 2025 г.**

Заявление на участие в аукционе подается с приложением следующих документов: заверенная банком копия платежного документа о внесении суммы задатка на расчетный счет организатора торгов; копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя; эскиз средства наружной рекламы, выполненный в цвете на бумажном носителе в формате А4 или электронном носителе. Физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем предоставляется документ, удостоверяющий личность; представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утверждённым Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 7 июля 2021 г. № 395. До начала аукциона его участники проходят регистрацию (в т.ч. доводится информация о затратах на организацию и проведение аукциона). Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором торгов. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, начальной цены, шага аукциона. Шаг аукциона: от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона, который является победителем аукциона. Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, о чем комиссией составляется протокол о признании аукциона несостоявшимися, если заявление на участие в нем подано только одним участником, или для участия в аукционе не было подано ни одного заявления, или на аукцион явился один из участников, или ни один из участников не явился на аукцион.

Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Для получения разрешения на размещение средства наружной рекламы рекламораспространитель (победитель аукциона) представляет в Гродненский городской исполнительный комитет заявление и иные документы, предусмотренные в регламенте административной процедуры по получению разрешения на размещение средства наружной рекламы, не позднее 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах торгов.

Гродненский городской исполнительный комитет и рекламораспространитель (победитель аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня регистрации заявления заключают договор на размещение средства наружной рекламы, в соответствии с которым победителю аукциона предоставляется право на использование городской среды в рекламных целях.

Рекламораспространитель (победитель аукциона):

1. самостоятельно получает технические условия и изготавливает проект на электроснабжение средства наружной рекламы, с учетом требований СП 4.04.01-2022 (если это требуется). При производстве строительно-монтажных работ руководствуется Правилами по охране труда при выполнении строительных работ (Постановление № 24/33 от 31.05.2019 Министерства труда и социальной защиты Республики Беларусь и Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь).

2. несет ответственность за несущую способность, монтаж и эксплуатацию средства наружной рекламы, и разрабатывает техническую документацию на конструкцию. Монтаж средства наружной рекламы, осуществляет из элементов заводского изготовления, в соответствии с действующими строительными и нормативно-техническими требованиями.

3. обязан содержать средство наружной рекламы в надлежащем техническом и эстетическом состоянии.

4. после окончания размещения средства наружной рекламы обязан демонтировать рекламную конструкцию (наземную часть и фундамент), восстановить газонное и/или тротуарное покрытие.

5. По лотам № 1-3: размещает средство наружной рекламы в течение двух месяцев со дня выдачи разрешения на размещение средства наружной рекламы.

По лотам № 4-7:

- размещает средство наружной рекламы в течение двух месяцев со дня выдачи разрешения на размещение средства наружной рекламы.
- обращается в эксплуатирующую организацию (ОУПП «Гродненское городское ЖКХ») за разрешением на проведение работ по монтажу средства наружной рекламы и передает демонтированные элементы остановочного навеса эксплуатирующей организации до начала установки средства наружной рекламы.
- согласовывает внешний вид средства наружной рекламы с Управлением строительства, архитектуры и градостроительства Гродненского городского исполнительного комитета.
- предусматривает: место для размещения расписания движения пассажирского транспорта, название остановочного пункта транспорта общего пользования, установку скамейки на всю длину навеса. Размещает лайтпостер с левой стороны. Правая боковая стенка остановочного навеса выполняется в размере 1/2 от ее длины. Остановочный навес должен быть выполнен без зазоров между конструктивными элементами.

По лоту № 8: размещает средство наружной рекламы в течение шести месяцев со дня выдачи разрешения на размещение средства наружной рекламы.



ИНФОРМАЦИЯ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукциона:** Мядельский сельисполком Мядельского района Минской области, тел.: (801797) 40735, 22352.
**День и время проведения аукциона: 27 июня 2025 г. в 14.00.**

**Место проведения аукциона:**
**Минская обл., г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, к. 15**

**Лот № 1 Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Гатовичи, ул. Новая, У-12,** **площадью 0,1271 га**
(кадастровый номер 624083103601000340), начальная цена – 47 000 руб.

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by** (http://minsk-region.gov.by/dlya_delovykh_lyudey/auktsiony/), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** (http://gki.gov.by/ru/auction/), Мядельского районного исполнительного комитета (**myadel.gov.by**).

УНП 600380436



**Первичная профсоюзная организация общества с ограниченной ответственностью «Строительно-инвестиционная компания ГорТелекомСтрой»** Белорусского профессионального союза работников строительства и промышленности строительных материалов ликвидируется в связи с прекращением финансово-хозяйственной деятельности общества с ограниченной ответственностью «Строительно-инвестиционная компания ГорТелекомСтрой».

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220036, г. Минск, пер. Загородный 3-й, д. 4В, пом. 8.

УНП 100799172



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»** (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды имущества, принадлежащего **УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений** на праве хозяйственного ведения (Продавец).

**Аукцион состоится 19.06.2025 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1:** Части пола площадью 1,0 кв. м в здании пассажирского павильона с инв. № 500/С-63525. Адрес: г. Минск, ул. Любаво-Роменская, 16/2. **Срок договора аренды** – 5 лет. **Начальная цена с НДС 20 %** – 4,69 руб.

**Лот № 2:** Части пола площадью 1,0 кв. м в здании кассового павильона № 2 с инв. № 500/С-63528. Адрес: г. Минск, ул. Асаналиева, 1А. **Срок договора аренды** – 5 лет. **Начальная цена с НДС 20 %** – 4,69 руб.

**Лот № 3:** Части пола площадью 2,0 кв. м в здании остановочного пункта «Масюковщина» с инв. № 500/С-55619. Адрес: г. Минск, ул. Михася Лынькова, д. 20. **Срок договора аренды** – 5 лет. **Начальная цена с НДС 20 %** – 9,39 руб.

**Лот № 4:** Части пола площадью 2,0 кв. м в капитальном строении здании вокзала ст. Уша с инв. № 600/С-62821. Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, участок железной дороги Минск-Вильнюс, ст. Уша, участок 15. **Срок договора аренды** – 5 лет. **Начальная цена с НДС 20 %** – 9,39 руб.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

ПА СЕЗОНЕ

# ХУТКА АДКРЫЕЦЦА НАВІГАЦЫЯ МАЛАМЕРНЫХ СУДНАЎ

## Водны транспарт трэба ўзаконіць не пазней чым за месяц пасля яго куплі



Судна ўмяшчальнасцю да 12 чалавек і даўжынёй да 20 метраў лічыцца маламерным, адзначыў **начальнік Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах Юрый БАГДАНЧЫК.** Паводле яго слоў, апошнім часам значна павялічылася колькасць суднаў, якія рэгіструюцца і праходзяць тэхнічныя агляды (ТА), — у сярэднім каля 10 тысяч штогод.

### АБАВЯЗКОВЫЯ ЎМОВЫ

Юрый Багданчык нагадаў, што навігацыйны перыяд пачынаецца з 31 мая. У гэты час афіцыйна дазваляецца выхад на ваду лодак, катараў, гідрацыклаў і іншых маламерных суднаў. Такі водны транспарт карыстаецца павышанай папулярнасцю ў насельніцтва, а перад стартам навігацыі ў нашай краіне зарэгістравана больш за 180 тысяч бартоў.

Што павінны ўлічыць уладальнікі маламерных суднаў перад стартам навігацыі? Як падкрэсліў Юрый Багданчык, дзяржрэгістрацыі і класіфікацыі падлягаюць маламерныя судны грузападымальнасцю больш за 225 кілаграмаў. Але ёсць нюанс. Нават калі грузападымальнасць меншая за гэта значэнне, аднак лодка абсталявана любым рухавіком, электрычным або ўнутранага згарання, яна таксама падпадае пад рэгістрацыю, класіфікацыю і патрабуе праходжання тэхнічнага агляду.

Нядаўна набытую лодку варта паставіць на ўлік у інспекцыі не пазней чым 30 дзён пасля яе пакупкі. Барты ў эксплуатацыі таксама павінны быць улічаны. Вяслярныя судны без матора ўзростам да 10 гадоў праходзяць тэхагляд адзін раз на 5 гадоў. Такі ж нестары транспарт, але з маторам — раз на 3 гады. Лодкі, старэйшыя за 10 гадоў, з рухавіком павінны праходзіць тэхнічны агляд штогод. Трохі адрозніваюцца гэтыя тэрміны для гідрацыклаў. Тыя, якім не споўнілася 10 гадоў, варта прыганяць на ТА раз на 2 гады, старэйшыя — штогод.

### ТЭХАГЛЯД «З ДАСТАЎКАЙ»

Лепш загадзя ведаць, на што звернуць увагу спецыялісты. У першую чаргу на цэласнасць корпуса. Гумавую лодку надзімаюць, правяраюць, ці няма дзірак, праколаў. Алюмініевыя або пластыкавыя аглядаюцца на прадмет наяўнасці расколін, асабліва на швах. На судне варта мець двухкілаграмовы вогнетушыцель (акрамя гідрацыкла), стандартную вадзіцельскую аптэчку, чарпак з матэрыялу, які не тоне, і выратавальныя камізэлькі на тую колькасць чалавек, якая пазначана ў дакументах на лодку. Калі борт з рухавіком, тады звяраюць яго нумары, глядзяць, ці няма выцякання масла ці паліва. Зразумела, лодкі павінны быць афарбаваны, а бартавы нумар — добра чытацца.

Прайсці тэхнічны агляд можна на любым участку спецыялізаванай інспекцыі, а не толькі па месцы рэгістрацыі ўладальніка. Дастаткова наяўнасці судна, суднавага білета, які яшчэ называюць тэхпашпартам, і аплаты дзяржпошліны. Да пенсіянераў інспектары могуць і на дом выехаць па папярэдняй дамоўленасці.

### УСЕ ЗАГІНУЛЫЯ — БЕЗ КАМІЗЭЛЕК

Дзякуючы досыць строгаму кантролю, нягледзячы на павелічэнне колькасці маламерных суднаў, колькасць загінулых змяншаецца. Так, у 2023-м іх было 22 чалавекі, а летась — 12. Не дапушчана гібелі дзяцей пры аварыях маламерных суднаў. Юрый Багданчык падкрэсліў: аналіз здарэнняў за 10 гадоў паказаў, што абсалютна ўсе загінулыя былі без выратавальных камізэлек. Гэта мужчыны ва ўзросце ад 35 да 70 гадоў. Большасць з іх альбо займаліся браканьерствам, альбо знаходзіліся на борце ў нецвярозым стане.

А за распіццё спіртных напояў пры кіраванні маламерным суднам пагражае неадкладнае пазбаўленне правоў. Такі дакумент павінен быць у тых, хто кіруе лодкай з рухавіком, чыя магутнасць перавышае 5 конскіх сіл, або 3,7 кілавата.

Дарэчы, штогод да адказнасці за парушэнне правілаў эксплуатацыі маламерных суднаў прыцягваецца каля 3000 чалавек. Самыя распаўсюджаныя парушэнні — адсутнасць выратавальных камізэлек і адзнакі аб праходжанні тэхнічнага агляду.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У ГАРМОНІІ З ПРЫРОДАЙ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У мэтах захавання найбольш каштоўных прыродных комплексаў і аб'ектаў біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці забяспечваецца функцыянаванне і развіццё сістэмы асабліва ахоўных прыродных тэрыторый (ААПТ). На пачатак года іх было 1355, яны займаюць больш за 1,9 млн га, што складае 9,2 % ад агульнай плошчы краіны. Планава вядзецца работа па павелічэнні іх колькасці і пашырэнні тэрыторыі, якая ахопліваецца.

Адным з эфектыўных інструментаў прыродаахоўнай дзейнасці з'яўляецца вядзенне нацыянальнай Чырвонай кнігі. У канцы сакавіка ўступіла ў сілу пастанова Мінпрыроды, якая скарэкціравала актуальны пералік відаў, што падлягаюць спецыяльнай ахове. Дададзена 13 новых у раздзел дзікіх жывёл і 5 — у дзікарослыя расліны. Выключана адпаведна 13 і 58 відаў. Усяго сёлетняе выданне Чырвонай кнігі ўключае 213 відаў дзікіх жывёл і 310 дзікарослых раслін. Да канца года чакаецца выпуск ілюстраванага пятага выдання, куды таксама ўвойдзе інфармацыя аб месцах насялення, біялогіі, мерах аховы.

У адносінах да рэдкіх відаў распрацоўваюцца планы кіравання і планы дзеяння па іх захаванні і аднаўленні. На сёння рэалізоўваюцца 30 планаў, якія датычацца дзікарослых раслін, і 13 — па дзікіх жывёлах. Дзякуючы гэтым мерам не толькі захоўваюцца асобныя віды, але і значна павялічваецца іх колькасць. Самы яскравы прыклад — папуляцыя зубра. У мінулым годзе была прынята схема рассялення гэтага звера. Дакумент, заснаваны на навуковых даследаваннях, вызначае прыярытэтныя месцы для яго ўсялення, улічвае раўнамернасць, кармавыя рэсурсы, колькасць.



Станоўчы вынік паказваюць папуляцыі такіх рэдкіх раней відаў, як барсук, рысь і мядзведзь. Паводле слоў Таццяны Жалязновай, сёння налічваецца больш за 2700 асобін барсука, 1600 — рысі і звыш 900 — бурага мядзведзя. Па двух апошніх, з улікам іх патэнцыяльнай небяспекі для чалавека і шкоды для гаспадарчай дзейнасці, навукоўцы ўзгаднілі меры рэгулявання, на іх дазволена кватаванае паляванне.

Сярод пагроз для біяразнастайнасці начальнік упраўлення адзначыла інвазіўныя віды. Не сустракаючы сур'ёзнага супрацьдзеяння, яны захопліваюць новыя тэрыторыі, прыгнятаючы, а то і проста знішчаючы абарыгенную флору і фаўну. Сёння на дзяржаўным узроўні распрацоўваюцца і выконваюцца праграмы па іх ліквідацыі і прадухіленні распаўсюджвання. Улічваючы, што адна з асноўных прычын з'яўлення чужародных відаў — антрапагенны фактар, барацьба з інвазіямі павінна весціся сістэмчатычна і на ўсіх узроўнях.

Увогуле, скарачэнне біяразнастайнасці — праблема глабальная. Таму на 15-й канферэнцыі краіны — удзельніцы Канвенцыі аб біялагічнай разнастайнасці, куды ўваходзіць і Беларусь, прынялі рамачную праграму. Яе мэта, як расказала Таццяна Жалязнова, амбіцыйная — пабудаваць да 2050 года свет, які жыве ў гармоніі з прыродай. Сярод ключавых элементаў 4 мэты і 23 задачы, якія трэба рэалізаваць да 2030 года. Калі ўсе краіны выканаюць узятыя на сябе абавязацельствы, то будучыя пакаленні змогуць паспяхова працягваць устойлівае выкарыстанне кампанентаў біялагічнай разнастайнасці, захоўваючы і прымнажаючы прыродныя рэсурсы, якія папаўняюцца.

**Андрэй АКІМАЎ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении. Месторасположение: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277, рег. знак АР 8176-7, 2014 г. в. | 20 804,75 |
| 2 | VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277-01, рег. знак АР 8243-7, 2014 г. в. | 20 804,75 |
| 3 | VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277, рег. знак АР 8177-7, 2014 г. в. | 20 852,75 |
| 4 | FORD TRANSIT INDEEC 29459-04, рег. знак АС 0218-7, 2012 г. в. | 8 900,75 |
| 5 | FORD TRANSIT VAN INDEEC 29459-04, рег. знак АР 8178-7, 2010 г. в. | 9 260,75 |
| 6 | FORD CONNECT INDEEC 294591-01, рег. знак АР 9557-7, 2011 г. в. | 6 236,75 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

